Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

15 ЖНІЎНЯ 2017 г. АЎТОРАК №155 (28519)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Слесар са Слуцка — зорка інтэрнэту

СТАР. 3

«Чытаю і буду чытаць «Звязду»!»

СТАР. 7

Скарына з мабільнікам: крэатыў ці абраза?

СТАР. 9

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір СЯМАШКА, намеснік прэм'ер-міністра:

«За апошнія 7 гадоў прадпрыемствы рэспублікі паставілі на экспарт у дзясятку краін машын і агрэгатаў для сельскагаспадарчай вытворчасці на суму амаль $17 млрд, што складае больш за 70% ад аб'ёму вытворчасці. Пагадзіцеся, дрэнную тэхніку на такую суму не прадасі. Па сукупнасці тэхнічных характарыстык, сваёй надзейнасці, узроўню сэрвіснага абслугоўвання гэтая тэхніка цалкам канкурэнтаздольная. Больш за тое, па цане яна значна таннейшая, чым імпартныя аналагі».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 15.08.2017 г.

Долар ЗША	1,9454	▼
Еўра	2,2973	▲
Рас. руб.	0,0325	▲
Укр. грыўня	0,0758	▼

ISSN 1990 - 763X

ПРАКАВЕТНАЕ

АЦАЛІ МЯНЕ, КРЫНІЦА

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Тысячы паломнікаў і турыстаў зноў завіталі на народнае прыгожае свята Макаўе, якое традыцыйна адзначаецца 14 жніўня ў Слаўгарадскім раёне каля знакамітай Блакітнай крыніцы. У гэты дзень тут адбываецца богаслужэнне і ўсе ахвотныя могуць прыняць хрышчэнне, як гэта рабілі нашы продкі тысячу гадоў таму. Як сведчыць гісторыя, менавіта тут першыя хрысціяне з племя радзімічаў прыносілі свае шчырыя абяцанні служыць Госпаду і радзіме. Ёсць шмат прыкладаў таго, што пасля акунання ў ваду і гарачай малітвы хваробы адступалі. І пацвярджэннем таму паломнікі не толькі з Беларусі, але і з блізкага і далёкага замежжа.

СТАР. 4

■ Наша тапаніміка

Звяздоўскі «дэсант» прызямліўся... на Зыслаў

У дні святкавання стагадовага юбілею калектыў «Звязды» наведаў мясціны, дзе ў гады Вялікай Айчыннай вайны выдавалася наша газета

Гэта сёння на партызанскім востраве, што на Любаншчыне, парушаюць цішыню спевы птушак і стракаценне конікаў, зрэдку — гул аўтамабільных маторaў і гоман людзей. У гады вайны тут былі іншыя гукі...

Гэтае прыгожае месца, з усіх бакоў акружанае балотам, дало прытулак многім партызанам. Тут размяшчаліся мінскія падпольныя абкамы КП(б)Б і ЛКСМБ, Любанскі падпольны РК КП(б)Б, дзейнічаў партызанскі аэрадром, разам за «Звяздой» выдаваліся маладзёжная газета «Чырвоная змена» і любанская раённа «Кліч Радзімы». Не выпадкова Зыслаў называлі другой Масквой.

Але перш чым трапіць на легендарны востраў, супрацоўнікі рэдакцыі наведалі Любанскі музей народнай славы. Тут нас сустракалі з хлебам і соллю, з песнямі. Вядома ж, не абышлося і без экскурсіі — край партызанскай і працоўнай славы, зямля Герояў і хлебаробаў, радзіма Шпілеўскага і Сыракомлі, эпіцэнтр народнага таленту і духоўнага багацця — Любаншчына бераўліва захоўвае сваю гісторыю.

— З дзяцінства мы прасякнуты любанскім гераізмам, энтузіязмам, адносінамі да роднай зямлі, людзі з Палесся ведаюць цану хлеба, — гаворыць **старшыня Любанскага раённага Савета дэпутатаў Віктар СТАТКЕВІЧ.** — Мы і сёння вырошчваем хлеб на нашай зямлі, адваяванай у лясоў і балот.

Тое, што на Любаншчыну завітаюць звяздоўцы, наша шматгадовая чытачка Марыя Свірыдовіч даведалася з газеты. Каб сустрэцца з любімымі журналістамі, паспяшалася раніцай да музея.

СТАР. 3

■ Жніво-2017

СЯЛО Ў ПАРАДКУ, КРАІНА Ў ДАСТАТКУ

У трох раёнах за дзень на жніве пабываў карэспандэнт «Звязды» — у рэйдзе разам з супрацоўнікамі міліцыі, МНС і пракуратуры. Наведалі гаспадаркі Шумілінскага, Полацкага і Верхнядзвінскага раёнаў. Некаторыя факты безгаспадарлівасці вартыя для напісання фельетонаў. І наадварот — Гаспадарлівасць з вялікай літары вартая пераймання.

Чакаюць запчасткі з... Турцыі

Мэта рэйду — праверыць, ці ўсё робіцца дзеля таго, каб жніво прайшло без надзвычайных здарэнняў, каб ураджай быў сабраны без страт. Калі мы ехалі, то замест таго, каб любавацца прыгажосцю навакольля, пільна ўглядаліся ў палі і накіроўваліся туды, дзе працавала тэхніка. Дзень выдаўся спякотны: тэмпература паветра больш за 30 градусаў па Цэльсію. У такое надвор'е добра разумееш, што словы пра «бітву за ўраджай», «цяжкую працу хлебаробаў» — не прыдуманыя. Так яно і ёсць: ва ўмовах, блізкіх да крытычных, з раніцы да позняга вечара і часта ноччу вяскоўцы працуюць на палях.

СТАР. 4

САЦЫЯЛЬНЫЯ МЭТЫ СТАЛІЦЫ

Акцэнт на інвестыцыях і росце зарплаты

Строгае патрабаванне з кіраўнікоў Мінска будзе за выкананне прагнозных паказчыкаў па працаўладкаванні на новыя працоўныя месцы, росце заработнай платы і прыцягненні прамых замежных інвестыцый. Пра гэта заявіла кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля КАЧАНАВА ўчора на аператыўнай нарадзе ў Мінгарвыканкаме.

Як паведамляе БЕЛТА, Наталля Качанава акцэнтавала ўвагу на ролі кіраўнікоў адміністрацый раёнаў Мінска. «Усе пытанні, якія датычацца работы прадпрыемстваў і арганізацый, пытанні, ад якіх залежыць жыццё людзей на тэрыторыях, павінны вырашацца адказна і аператыўна, — сказала яна. — Прагнозныя паказчыкі ў сталіцы павінны быць забяспечаны, варта распачаць для гэтага ўсе неабходныя захады».

Наталля Качанава лічыць, што Мінск павінен паказаць прыклад рэгіёнам краіны ў гэтай працы. Што да выканання ўстаноўленага задання па працаўладкаванні на нядаўна створаныя працоўныя месцы, то гэтым трэба ўшчыльную займацца і кіраўнікам адміністрацый, і кіраўнікам на месцах.

«Пастаўлена задача да 1 кастрычніка прыняць абноўлены Дэкрэт №3. Акцэнт пераносіцца на мясцовыя органы ўлады. Вы павінны адсачыць кожнага чалавека, скласці вывераныя спісы — прапануйце людзям працу, дапамагайце ім з працаўладкаваннем», — сказала Наталля Качанава.

Мінску даведзена задание дасягнуць у снежні ўзроўню сярэдняй заработнай платы ў 1385 беларускіх рублёў. «Трэба не толькі выйсці ў снежні на гэты параметр, але і ўтрымаць яго», — падкрэсліла кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

Наталля Качанава таксама звярнула ўвагу на неабходнасць дашліфаваць парадак у Мінску. «Да ўтрымання тэрыторый у цэнтры сталіцы, як паказаў аб'езд, пытанняў няма. Чаго не скажаш пра дваровыя тэрыторыі на ўскраінах, — канстатавала яна. — Усе, хто прыязджае ў Мінск, адзначаюць, што горад прыгожы і чысты. Але трэба парадак дашліфаваць — ёсць праблемныя месцы».

Яна зрабіла акцэнт на аб'ектах незавершанага будаўніцтва. «Вазьміце сітуацыю на кантроль — пытанні трэба аператыўна вырашаць, зацягваць з гэтым нельга», — паставіла задачу Наталля Качанава. На яе думку, выкананне пастаўленых Мінску задач рэальнае — патэнцыял у сталіцы значны. «Пастаўлена задача — выконвайце, даводзьце да лагічнага завяршэння», — рэзюмавала кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта, звяртаючыся да ўдзельнікаў нарады. І дадала, што ў краіне выбудаваная нармальная, сур'ёзная праца па ўсёй вертыкалі.

Надзея ЮШКЕВІЧ.
yushkevich@zviazda.by

■ Трэ пытанні да ўлады

І пра хлеб, і пра відовішчы

«Звязда» пацікавілася поспехамі развіцця Кіраўскага раёна

Кіраўскі раён сёлета стаў першым «тысячнікам» у Магілёўскай вобласці па намалоце і перавозцы збожжа ад камбайнаў. Высокі вынік паказалі экіпаж адкрытага акцыянернага таварыства «Рассвет имени К. П. Орловского» ў складзе старшага камбайнера Івана Салановіча і камбайнера Івана Багеля, а таксама кіроўцы гэтай жа гаспадаркі Аляксандр Бабіч і Генадзь Гукаў. Наогул сельскагаспадарчая галіна ў раёне развіваецца дастаткова імкліва. А яшчэ менавіта на тэрыторыі Кіраўшчыны вядзецца аднаўленне аднаго з унікальных палацава-паркавых комплексаў Беларусі. Спецыялісты ставяць яго на адзін узровень з Нясвіжскім і Мірскім замкамі. Больш падрабязна на гэтыя тэмы «Звязда» пагутарыла з кіраўніком раённай улады Аляксандрам БУТАРАВЫМ.

— У апошнія гады Кіраўскі раён паказвае добрыя вынікі работы сельскагаспадарчай галіны. Сёлетні, здаецца, не выключэнне?

— Так. І тэмпы жніва, дзе добрыя вынікі паказалі камбайнеры і кіроўцы таварыства «Рассвет имени К. П. Орловского», — прамое таму пацвярджэнне. Па стане на 14 жніўня раён з'яўляецца лідарам у Магілёўскай вобласці па тэмпе ўборкі збожжавых і зернебабовых. Убрана 46,6 тысячы тон (70%) пры ўраджайнасці 37,2 ц/га (сярэднеабласны — 35 ц/га). Кіраўскі раён утрымлівае лідзіруючыя пазіцыі ў вобласці па вытворчасці малака (за 7 месяцаў з пачатку года выраблена 31,5 тысячы тон), сярэднесутачных прыбаўленнях буйной рагатай жывёлы (589 грамаў), узнаўленні статка. Годныя вынікі ёсць і ў раслінаводстве.

— Як у Кіраўскім раёне ідуць справы па рэканструкцыі ў кожнай сельскагаспадарчай арганізацыі малочнатаварных фермаў? Ці ёсць эканамічны эфект ад новых жывёлагадоўчых аб'ектаў?

— У кожнай сельскагаспадарчай арганізацыі раёна праведзена мадэрнізацыя малочнатаварных фермаў, пабудавана 8 радзільных аддзяленняў з цэхам сухастойных кароў, узведзена чатыры і вядзецца работа па рэканструкцыі сямі прафілакторыяў для ўтрымання маладняку буйной рагатай жывёлы ў індывідуальных станках. Набыта 12 пастэрызатараў малака. Ва ўсіх сельскагаспадарчых арганізацыях ёсць кормараздатчыкі-змяшальнікі, працуе 8 станцый дакорму з выкарыстаннем грануляваных высокабялковых кармоў прамысловай вытворчасці. Сёлета пачата будаўніцтва малочнатаварнай фермы на 768 жывёламесцаў у адкрытым акцыянерным таварыстве «Рассвет имени К. П. Орловского». Эфектыўнасць вытворчасці малака на малочнатаварных фермах, абсталяваных даільнымі заламі, складае 96%. Рэнтабельнасць галіны жывёлагадоўлі за 6 месяцаў з пачатку года склала 13,1% — гэта плюс 7,3 працэнтных пункта да аналагічнага перыяду мінулага года. Сёлета ўдоі на карову плануем атрымаць больш за 6000 кілаграмаў, сярэднясутачныя прыбаўленні ў вазе буйной рагатай жывёлы — 700 грамаў.

— На тэрыторыі Кіраўскага раёна вядуцца рэстаўрацыйна-аднаўленчыя работы помніка архітэктуры XVIII—XIX стагоддзяў Жыліцкага палацава-паркавага ансамбля. Што ўжо зроблена на аб'екце і якія перспектывы?

— Жыліцкі палац — гэта наш гонар, і ён па праве з'яўляецца «архітэктурнай жамчужынай» не толькі Магілёўскай вобласці, але і краіны. Нагадаю, што рэстаўрацыйна-аднаўленчыя работы пачаліся ў 2009 годзе. Фінансаванне аб'екта ажыццяўляецца са сродкаў дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы і абласнога бюджэту. Але мы былі б вельмі ўдзячныя спонсарам, калі б і яны прынялі ўдзел у фінансаванні работ. Гэта дало б магчымасць хутчэй давесці справу да канца, каб турысты ўбачылі гэты ўнікальны комплекс ва ўсёй красе. **Тыя, каму не абыякавая гісторыя роднай краіны і хто жадае ўнесці ўклад у аднаўленне Жыліцкага палаца, могуць скарыстацца дабрачынным рахункам установы культуры «Жыліцкі гістарычны комплекс-музей» 3642108762277 ААТ «АСБ Беларусбанк», філіял №703, г. Бабруйск.**

Рэстаўрацыйныя работы на аб'екце праводзяцца паэтапна. Першая чарга, дзе сёння знаходзіцца «Дзіцячая школа мастацтваў», уведзена ў эксплуатацыю 29 жніўня 2011 года. Першы этап другой чаргі, падчас якой быў адноўлены паўднёвы бакавы флігель (сёння тут размяшчаецца музей), уведзены ў эксплуатацыю 20 лістапада 2013 года. Цяпер вядуцца рэстаўрацыйна-аднаўленчыя работы трэцяй чаргі — галоўнага корпуса і часткі паўночнага крыла пад музей, карцінную галерэю, бібліятэку і інтэр'еры галоўнага корпуса. На сённяшні дзень выканана частковае ўзмацненне падмурка, зроблена атынкоўка фасада і ўнутраных памяшканняў, устаноўлены вокны, ацяпляльныя сістэмы, праведзены іншыя работы. Чацвёртая чарга праекта прадугледжвае аднаўленне парку і воднай сістэмы. Упэўнены, што пасля завяршэння ўсіх рэстаўрацыйных работ Жыліцкі палац стане сапраўднай турыстычнай «іскрынкай» і адным з найбольш папулярных у краіне турыстычных аб'ектаў.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

■ Партнёры

Кругасветнае падарожжа за адзін дзень. Прыпынак — Беларусь

Як мы паказалі сябе на «ЭКСПА-2017»

У нядзелю на міжнароднай спецыялізаванай выстаўцы «ЭКСПА-2017» у Астане прайшоў Нацыянальны дзень Беларусі, паведамляе прэс-служба Савета Міністраў. Наша краіна прадстаўлена там нацыянальным павільёнам, яго наведвальнікі ў інтэрактыўнай форме могуць даведацца пра найноўшыя беларускія навукоўтэхнічныя распрацоўкі, а таксама пра перспектыўныя інвестыцыйныя праекты.

Як заявіў падчас свайго выступлення на афіцыйнай цырымоніі адкрыцця Нацыянальнага дня Беларусі прэм'ер-міністр нашай краіны Андрэй Кабякоў, наш павільён наглядна дэманструе дасягненні краіны ў розных сферах. Тут госці могуць пазнаёміцца з дзейнасцю Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень». Акрамя гэтага, у нашым павільёне прадстаўлены ўвесь спектр машынабудаўнічай галіны айчыннай эканомікі. У прэзентацыях зроблены асаблівы ўпор на шырокае выкарыстанне ІТ-тэхналогій. Нацыянальны каларыт і самабытнасць нашай культуры адлюстраваны ў ільняных, скураных, керамічных і саламяных вырабах — у тым ліку ручной работы.

«Выстаўкі «ЭКСПА» — гэта ўнікальныя па сваёй сутнасці мерапрыемствы. На іх дзяржавы наглядна дэманструюць дасягненні ў розных сферах, расказваюць пра нацыянальную культуру, традыцыі, гісторыю. У сваю чаргу наведвальнікі маюць выдатную магчымасць здзейсніць кругасветнае падарожжа за адзін дзень, убачыць на ўласныя вочы, якая разнастайная сусветная цывілізацыя, якая цудоўная наша планета. Канцэпцыя Нацыянальнага павільёна Беларусі пабудавана менавіта на гэтых ідэях», — падкрэсліў Андрэй Кабякоў.

Фота БЕЛТА.

Па словах прэм'ера, асноўная тэма ЭКСПА-2017 у Астане — «Энергія будучыні» — вельмі актуальная для ўсёй Зямлі. Ён звярнуў увагу, што Беларусь, як і многія іншыя ўдзельнікі «ЭКСПА», выбудоўвае сваю энергетычную палітыку такім чынам, каб не дапусціць негатыўнага ўплыву знешніх фактараў на развіццё краіны. «У Беларусі на змену традыцыйным газу, драўніне і вугалю паступова прыходзяць такія крыніцы энергіі, як вецер, сонца, біяпаліва. Мы развіваем мірны атам, будуем у сябе атамную электрастанцыю, якая стане адной з самых сучасных і бяспечных АЭС у свеце. Перакананы, што толькі сумеснымі намаганнямі мы зможам захаваць прыродны патэнцыял нашай планеты, забяспечыць даступнасць энергіі будучыні для новых пакаленняў», — адзначыў Андрэй Кабякоў.

Падчас візіту ў Казахстан кіраўнік беларускага ўрада сустрэўся са сваім калегам — прэм'ер-міністрам Рэспублікі Казахстан Бактыжанам Сагінтаевым. На працягу сустрэчы былі абмеркаваны актуальныя пытанні як двухбаковага супрацоўніцтва, так і ўзаемадзеяння ў рамках інтэграцыйных аб'яднанняў. Бактыжан Сагінтаеў сярод іншага паведаміў, што распачата актыўная падрыхтоўка візіту прэзідэнта Казахстана Нурсултана Назарбаева ў Мінск. Даты пакуль узгадняюцца, арыенціровачна гэта можа адбыцца ў канцы лістапада.

Кіраўнікі ўрадаў Беларусі і Казахстана прынялі ўдзел у адкрыцці выстаўкі «Made in Belarus. Astana» і работы беларуска-казахстанскага бізнес-форуму.

Надзея ЮШКЕВІЧ.
yushkevich@zviazda.by

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Каралева Брытаніі Лізавета II збіраецца на пенсію?

Брытанская каралева Лізавета II, якой сёлета споўніўся 91 год, праз чатыры гады збіраецца адмовіцца ад трона і перадаць карону свайму сыну прынцу Чарльзу. Пра гэта паведаміла газета The Mirror са спасылкай на свае крыніцы ў Букінгемскім палацы.

Выданне сцвярджае, што каралева ўжо паведаміла пра свае планы блізкаму акружэнню. Акрамя гэтага, ужо запушчана працэдура падрыхтоўкі неабходных дакументаў для змены манарха.

«Я размаўляў з некалькімі высокапастаўленымі прыдворнымі, якія ясна далі зразумець, што падрыхтоўка да перадачы кароны прасоўваецца наперад», — сказаў у каментарыі Daily Mail афіцыйны прадстаўнік каралевы Роберт Джобсан. Іншая крыніца ў Букінгемскім палацы паведаміла, што «яе вялікасць памятае пра свой узрост і хоча пераканацца, што, калі надыдзе час, перадача кароны будзе спакойнай».

Каралева Лізавета II узышла на трон у 1952 годзе.

Сотні палякаў выйшлі на акцыю пратэсту супраць маштабнага высякання дрэў у Белавежскай пушчы

Гэта быў іх адказ ураду, які вырашыў правесці ў старажытным лесе нарыхтоўкі драўніны, піша Associated Press.

Белавежская пушча занесеная ў спіс Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА, паколькі з'яўляецца адным з апошніх першабытных лясоў Еўропы. Польскі ўрад вырашыў правесці ў пушчы лесанарыхтоўкі. Ён тлумачыць гэта барацьбой з жуком-караедам. Улады запэўніваюць, што ўсе дзеянні ў Белавежскай пушчы маюць выключна ахоўны характар. Тым не менш Еўрапейскі суд яшчэ ў ліпені пастанавіў неадкладна спыніць высякание дрэў. Але ўлады краіны парушылі прадпісанне. Эколагі ЕС выступаюць супраць лесанарыхтовак.

У нядзелю да польскіх актывістаў далучыліся эколагі з Германіі, Нідэрландаў, Чэхіі і іншых краін Еўропы, каб супрацьстаяць таму, што яны лічаць разбурэннем унікальнага прыроднага ўчастка.

Раней паведамлялася, што польскі ўрад можа запатрабаваць ад Еўрапейскай камісіі 2,5 млрд еўра кампенсацыі, калі Брусель будзе працягваць настойваць на спыненні высякання дрэў у Белавежскай пушчы.

Ад паводак і апоўзняў у Непале загінулі 70 чалавек

У Непале расце колькасць загінулых ад паводак і апоўзняў, да якіх прывялі ліўні, што працягваюцца апошнія тры дні.

Паводле апошніх даных, наступствы прыроднай стыхіі забралі жыцці 70 чалавек, інфармуе ТАСС са спасылкай на Рэйтэр. Стыхія закранула каля 100 тысяч непальцаў. У паўднёвых частках краіны свае дамы пакінулі каля 50 тыс. чалавек, цяпер яны размешчаны ў школах і адміністрацыйных будынках. Выратавальныя каманды дапамагаюць заблакаваным людзям на дахах дамоў. Улады не выключаюць, што колькасць загінулых і пацярпелых будзе павялічвацца.

Звяздоўскі «дэсант» прызямліўся... на вастраў Зыслаў

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Усё жыццё выпісваю «Звязду», — прызналася Марыя Арцёмаўна. — Некалькі выданняў выпісвала, але «Звязда» — самая лепшая. Нават прыяцельку сагітавала пасябраваць з газетай. Там на ўсе пытанні ёсць адказы, журналісты пішуць на розныя тэмы. Яшчэ мой бацька «Звязду» выпісваў! Памятаю, як аднойчы адшукалі ў яго нумары газеты за 1940-я гады, якія сёння захоўваюцца ў нашым музеі.

Як падкрэсліў **начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Любанскага райвыканкама Васіль КАТКАВЕЦ,** са «Звяздой» Любаншчыну звязвае даўняе сяброўства. «І не толькі таму, што ў гады вайны тут размяшчалася падпольная рэдакцыя, — кажа ён. — На працягу свайго існавання «Звязда» асвятляла падзеі, якія адбываліся ў раёне, пісала пра людзей, якія праславілі свой край. І сёння газета — наш галоўны інфармацыйны партнёр».

Урэчча, Калінаўка, Сосны, Нежын, Камуна... — здаецца, няма такой вёскі на Любаншчыне, пра якую не ведае **мясцовы краязнавец і гісторык Анатоль ВЯЛІЧКА.** Пакуль ехалі ў вёску Дварэц, дзе выдавалася партызанская «Звязда», ён расказаў пра асаблівасці кожнага населенага пункта, які праязджалі; людзей, што праславілі сваю малую радзіму. Не забыўся, вядома, і пра тое, калі сюды прыехаў Янка Купала — менавіта гэтыя краявіды и праца людзей натхнілі песняра на яго знакамітую «Над ракой Арэсай». Дарэчы, упершыню паэма была надрукавана ў «Звяздзе».

У Дварцы, дзе ў студзені 1943 года быў адноўлены выпуск падпольнай «Звязды», нас чакалі мясцовыя жыхары. Павітацца з супрацоўнікамі «Звязды» выйшла і гаспадыня хаты, дзе вісіць шыльда, якая сведчыць аб подзвігу нашых папярэднікаў, Лідзія Бубіч. Прыйшоў на сустрэчу — дакладней, пад'ехаў — і сын былой гаспадыні, Марфы Мігун, якая дала свае пакоі для падпольнай тыпаграфіі. За гэта ўжо пасля вайны ў знак удзячнасці дзяржава пабудавала ёй новую хату. На гэтых сценах акурат перад Днём друку ў 1975 годзе і з'явілася мемарыяльная шыльда, якая сведчыць, што тут выдавалася партызанская «Звязда».

У Дварцы згадалі і тых, хто выдаваў падпольную «Звязду». Анатоль Вялічка расказаў пра той перыяд у вершах:

У Любанскім краі — вёска Дварэц.
У ляску, дзе Арэса-рака.
У гады ліхалецця прытулкам
Стала ты для газеты «Звязда».

Тут Барашкаў —
нястомны рэдактар,
Рэдагуе і правіць лісты.
Каб у тэрмін народу данесці
Весткі з фронту радзімай Масквы.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Так з Дварца, з хаты Марфы Мігун,
Слова праўды надзейна «страляла».
«Біце злыдняў-фашыстаў штодня», —
У краі родным «Звязда» заклікала.

Вераніка КАНЮТА.
kanyuta@zviazda.by

Любанскі раён.

■ Надвор'е

Спёка вернецца ў канцы тыдня, дажджы — таксама

На гэтым тыдні сіноптыкі зноў прагназуюць у Беларусі цёплае надвор'е. Пра гэта паведамляюць у Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды. У другой палове тыдня тэмпература паветра днём у асобных рэгіёнах будзе перавальваць за +30 °С.

Фота БЕЛТА.

На пачатку тыдня ўмовы надвор'я на тэрыторыі краіны будзе дыктаваць вобласць павышанага атмасфернага ціску. Чакаецца пераменная воблачнасць, без ападкаў. Ноччу і ранкам у асобных раёнах магчымы непрацяглыя слабыя туманы. Сёння, у аўторак, тэмпература паветра ноччу складзе 8—14 градусаў цяпла, па паўднёвым усходзе — да плюс 16. Днём слупок тэрмометра падымецца да 21—27 градусаў вышэй за нуль. Падобнае надвор'е будзе і ў сераду: ноччу 9—16 вышэй за нуль, днём — 23—29 цяпла.

Пасля гэтага пад уплывам высокага атмасфернага ціску з тэрыторыі Заходняй Еўропы пачнуць змяшчацца малаактыўныя атмасферныя франты, якія прынясуць больш цёплыя і вільготныя паветраныя масы. У асобных раёнах пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Ноччу і ранкам чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ў чацвер ноччу складзе 13—18 вышэй за нуль, удзень слупок тэрмометра падымецца да 23—29 градусаў, а па поўдні краіны — да 30—31. У пятніцу ноччу будзе 11—19 цяпла, удзень — 14—29, а па поўдні да плюс 30—32.

Паводле папярэдніх прагнозаў, аналагічнае надвор'е захаваецца і на выхадныя. У суботу пераважна ў паўночна-заходніх раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Ноччу і ранкам чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 13—20 градусаў вышэй за нуль, удзень — 25—32. У нядзелю ноччу па захадзе, а днём па большай часці тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах чакаюцца навальніцы. Ноччу і ранкам слабы туман. Тэмпература паветра ў цёмны час сутак будзе 14—21 градусаў вышэй за нуль, удзень — 24—29 цяпла, а па ўсходзе Беларусі — 30—32 са знакам «плюс».

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ. *lyskavets@zviazda.by*

■

■ Зорка інтэрнэту

«КАМПОТЫ ВАРУ САМ»

Слесар са Слуцка расказвае ў інтэрнэце пра жыццё простага вясковага чалавека і спадзяецца знайсці «палавінку»

У сацыяльных сетках людзі звычайна хочуць здавацца лепшымі, чым ёсць на самай справе. Суцэльныя карцінкі прыгожага жыцця. Слесар са Слуцка Міхаіл ГАРДЗЕЙЧЫК вырашыў пайсці насуперак шаблонам і завёў Інстаграм «простага вясковага чалавека». Ніякага гламуру — случчанін дзеліцца фотаздымкамі прыроды, сваіх «ссабоек» і ўраджаю з агарода.

Міхаілу 28 гадоў. Раней працаваў і трактарыстам, і аператарам кацельнай. Цяпер уладкаваўся слесарам у ЖКГ. Амаль увесь вольны час мужчына прысвячае агароду.

— Вырошчваю бульбу, агуркі, памідоры, цыбулю. Тое, што і ўсе. У нас з бацькамі агульнае лецішча. Ці вялікі агарод? Для сябе хапае, — расказвае Міхаіл.

Ён сам варыць кампоты і варэнне, соліць агуркі. Пра што і расказвае на сваёй старонцы. «Я ўсё жыццё ў гэтай вясковай сферы, — усміхаецца ён, калі здзіўляемся такой гаспадарлівасці. — Бабуля, бацькі рабіць нарыхтоўкі навучылі».

Мяркуючы па Інстаграме мужчыны, ён шмат гатуе. І не толькі макарону і бутэрброды. Міхаіл смажыць кабачкі, умее запякаць труса і качку.

— Трусікаў самі гадуем, купляць дорага, — заўважае суразмоўнік. — Я асаблівa не гартаю часопісы, не шукаю рэцэпты. Што сам прыдумаю, тое і гатую.

Зарэгістравацца ў Інстаграме Міхаілу падказаў стрыечны брат. Случчанін прызнаецца: з дапамогай інтэрнэту спадзяецца пазнаёміцца з дзяўчынай.

— Шукаю такую, як я, — простую. Гаспадыню.

— І што, складана знайсці?

— Шчыра скажу, я яшчэ такіх не сустракаў. Можа, не там шукаю? *(Смяецца)* Знаёміцца ўжывую часу няма. Гэта трэба хадзіць кудысьці — у клуб, на канцэрт. Не на вуліцы ж знаёміцца. Дый цяпер у інтэрнэце ўсе сядзяць.

На адным з фота Міхаіл трымае букет рамонкаў. «Дару ўсім дзяўчатам», — стаіць подпіс. «Рамонкі проста былі пад рукой. А так у мяне на лецішчы шмат кветак», — запэўнівае халасцяк.

Случчанін любіць фатаграфаваць прыроду. На работу ён ездзіць на веласіпедзе, таму яму часта ўдаецца падлавіць прыгожыя кадры.

Пасля таго як акаўнт Міхаіла заўважылі СМІ, колькасць яго падпісчыкаў выросла ў дзесяць разоў. Цяпер за жыццём случчаніна сочаць амаль 1,2 тысячы чалавек. Відаць, падкупляе шчырасць і прастата мужчыны.

А Міхаіл цяпер думае, як зрабіць сваю старонку ў інтэрнэце яшчэ цікавейшай. Складае план фота кожны дзень, каб не выкладаць адно і тое ж. Збіраецца навучыцца здымаць відэа. І набыць новы тэлефон, з больш якаснай камерай.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
lubneuskaya@zviazda.by

■

■ Здарэнне

У СТАЛІЦЫ ГАДЗЮКА ЎКУСІЛА ХЛОПЧЫКА

Пры сустрэчы з ёй — ніякіх рэзкіх рухаў

Мінскія ратавальнікі адлавілі гадзюку ў мікрараёне Каменная Горка. Дагэтуль яна паспела ўкусіць 10-гадовага хлопчыка. Здарэнне адбылося ў дварах дома па вуліцы Кунцаўшчына. Змяя знаходзілася каля пад'езда, яна прыцягнула ўвагу дзяцей. Калі адзін з іх працягнуў да яе руку, тая ўкусіла. Гэта ўжо другі выпадак за тыдзень, калі ў сталіцы фіксуюцца здарэнні з гадзюкамі. Да гэтага ратавальнікі дасталі паўзуна з газавай пліты ў кватэры па вуліцы Ландэра.

Міністэрства па надзвычайных сітуацыях у выпадку, калі давялося ўбачыць змяю, рэкамендуе не спрабаваць яе злавіць і не рабіць рэзкіх рухаў. Гадзюка звычайная — ядавітая змяя, якая жыве ў беларускіх лясах. У сувязі з тым, што клімат мяняецца, яна можа апынуцца ў горадзе. Змяя амаль ніколі не нападае на чалавека першай, таму пры сустрэчы не варта спрабаваць яе злавіць або прыціснуць да зямлі. Гэта адносіцца і да дарослых асобін, і да дзіцянят, якія толькі вылупіліся з яйка: яны аднолькава ядавітыя. Нельга рабіць рэзкіх рухаў і правакаваць змяю да нападзення. МНС раіць даць змяі адпаўзці і не забіваць яе. Калі змяя запаўзла ў дом, нельга лавіць яе самастойна. Трэба пакінуць памяшканне, папярэдзіць родных і суседзяў і паведаміць аб здарэнні ратавальнікам па тэлефоне МНС 112. Калі ўсё ж такі не ўдалося пазбегнуць укусу, неабходна выклікаць хуткую медыцынскую дапамогу па тэлефоне 103. Каб запаволіць распаўсюджванне яду, трэба абмежаваць рухомасць пацярпелага, пры ўкусе канечнасцяў накласці шыну.

Пры адсутнасці дыхання і пульсу прыступіць да сардэчна-лёгачнай рэанімацыі. Калі пацярпелы без прытомнасці — надаць яму стабільнае становішча на баку.

У першыя 10—15 хвілін пасля ўкусу выціснуць яд з ранкі — высмоктваць яго не рэкамендуецца. Прапануецца таксама прамыць месца ўкусу перакісам вадароду альбо вадой з мылам, апрацаваць краі раны антысептыкам. Рэкамендуецца піць вялікую колькасць вадкасці.

Сяргей РАСОЛЬКА.
rs@zviazda.by

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «Пинагрузсервис», г. Пинск, ул. Рокоссовского, д. 2

Предмет аукциона

Наименование	Общая площадь	Инвентарный номер	Адрес
Квартира №3	61,2 кв. м	130/С-40558	Брестская обл., **г. Пинск, ул. Ровецкая, 8- 3**

Начальная цена без НДС 20 % – 66 900,00 бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, г. Минск, ул. Коллекторная, 11 БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время проведения аукциона	**20.09.2017** в 11.00 по адресу: **г. Пинск, ул. Рокоссовского, д. 2, ОАО «Пинагрузсервис»**
Дата и время окончания приема документов	**18.09.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Контактные телефоны	**+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@cpo.by**

СЯЛО Ў ПАРАДКУ, КРАІНА Ў ДАСТАТКУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Разам з тым некаторыя рэчы, якія мы ўбачылі падчас рэйду, выклікалі пытанні. У адной з гаспадарак Шумілінскага раёна хлебаробы чакаюць неабходны «агрэгат» для зернесушылкі аж з... Турцыі. Хоць сушылка айчынная. Няўжо вытворца не мог паклапаціцца, каб праблем у вяскоўцаў з запчасткамі не было? Салідныя кампаніі, каб выйсці пераможцамі ў канкурэнтнай барацьбе, цяпер практыкуюць пастаўкі неабходных кампанентаў падчас эксплуатацыі іх тэхнікі...

У пракуратуры Віцебскай вобласці, дарэчы, плануюць зрабіць аналіз рацыянальнага набыцця і выкарыстання сельскагаспадарчых машын.

Хацелі, але не змаглі

У Полацкім раёне ў гаспадарцы, куды мы заехалі, на камбайне працаваў пенсіянер. У гэтым няма ніякага парушэння, тым больш што людзі на жніве ў дэфіцыце. Але пры камбайнеры не было дакумента, які пацвердзіў бы яго права кіраваць тэхнікай. А гэта ўжо, мякка кажучы, непарадак. Мужчына прызнаўся, што яго, да таго ж, не афармілі на часовую працу... Супрацоўніца МНС, у сваю чаргу, заўважыла, што вогнетушыцелі пры тэхніцы былі ў непрацоўным стане і не было побач ні вады, ні іншых сродкаў, каб пагасіць агонь, калі пажар, не дай бог, узнікне.

На поле прыехаў кіраўнік гаспадаркі. Высветлілася, што гаспадарка мае ўсяго чатыры камбайны, на жніве толькі два з іх...

Нават мне, чалавеку, далёкаму ад сельскай гаспадаркі, кінулася ў вочы, што збожжавае вырасла з травой. Кіраўнік растлумачыў, што пасадзілі травы, а вырасла... збожжа. Проста «звычайны цуд». Чаму на кармавыя не скруцілі тое, што ў полі? Спецыялісты заўважылі, што такі «сухі коктэйль» — добры корм для жывёлы. Кіраўнік адказаў: «Хацелі, але не змаглі, бо было вельмі сыра. І мы сюды не ўлезлі!» На пасадзе чалавек параўнальна нядаўна...

На адной з сушылак зерне падаравалася разам з рамонкам і іншай травой. Можа, новы від гарбаты на экспарт? Калі без жартаў, то эфект ад такога ўкладу ў агульны каравай сумнеўны.

На іншай планеце

А вось у гаспадарцы Шайтараве Верхнядзвінскага раёна можна праводзіць майстар-класы. Не сорамна будзе запрасіць на семінар і вяскоўцаў суседняй Латвіі. Адразу адчуваецца, што тут дысцыпліна і парадак. Калі параўнаць з убачаным падчас рэйду раней, тут як на іншай планеце.

Дарэчы, аўто з удзельнікамі рэйду «адказны за шлагбаум» не прапусціў. Не пераканалі яго людзі ў форме з пасведчаннямі супрацоўнікаў пракуратуры і міліцыі. Па інструкцыі нельга, і парушаць яе ён не збіраўся ні пры якіх умовах. Выклікаў начальства.

На механізаваным дварэ тут размешчана шмат тэхнікі. Ва ўсіх камбайнераў дакументы пры сабе. У тым ліку — пасведчанні аб павышэнні кваліфікацыі на кіраванне ад беларускага вытворцы («Гомсельмаш»). Такога нават вопытная прадстаўніца пракуратуры вобласці раней не бачыла.

За дзень гаспадарка намалочвае 400—600 тон збожжа. Ураджайнасць — каля 50 цэнтнераў з гектара. Увесь ураджай збожжавых выкарыстоўваецца для патрэб уласнага буйнога свінакомплексу. Каля сушылкі дзяўчаты ва ўніформе, падобныя на сцюардэс, змятаюць рассыпанае зерне. Загаловак для артыкула падказаў надпіс на адным са збудаванняў: «Калі сяло ў парадку, краіна ў дастатку!» Тут відавочна, што праца пастаўлена на высокі ўзровень. На развітанне нам падзякавалі за візіт. Маўляў, погляд з боку заўсёды карысны і дае магчымасць выправіць недахопы.

Вынікі рэйду пракаментавала **Вольга ГРЫЦКЕВІЧ, старшы пракурор аддзела па наглядзе за выкананнем заканадаўства і законнасцю прававых актаў пракуратуры Віцебскай вобласці**:

— Пра выяўленыя недахопы адразу па тэлефоне праінфармавала адказных асоб раённага і абласнога ўзроўню. Нельга сказаць, што райвыканкамы не кантралююць ход жніва. Але штодзённы выезд на палі і іншыя захады павінны быць эфектыўнымі.

Сёлета на Віцебшчыне плануецца сабраць не менш за 1,1 мільёна тон збожжа. Улічваючы кліматычную спецыфіку Прыдзвінскага краю, можна сказаць, што жніво тут завершаць пазней, чым у іншых рэгіёнах краіны. Падчас рэйду было відаць, што на некаторых палях яно яшчэ саспявае. Галоўнае, каб не было страт. Інспектарская дзейнасць праваахоўнікаў накіраваная на тое, каб прадухіліць парушэнні, у тым ліку тэхналагічныя.

Аляксандр ПУКШАНСКІ. *pukshanski@zviazda.by*

САБРАЛІ БОЛЬШ ЗА 5 МЛН ТОН ЗБОЖЖА

Уборачная кампанія ў краіне перасупіла экватар і імкліва пачынае рухацца да завяршэння. Паводле аператыўнай інфармацыі Мінсельгасхарча, у «бітве за ўраджай-2017» аграрыі краіны ўжо адваявалі 5072,2 тысячы тон збожжавых і зернебабовых культур з 64,8% плошчаў. Сярэдняя ўраджайнасць па краіне складае 36 ц/га.

У тройцы лідараў уборачнай гонкі дзве вобласці «мільённіцы». На першым месцы Міншчына, дзе сабралі ўжо 1211,6 тысячы тон збожжа. Далей за ёй па пятах ідуць аграрыі з Брэстчыны з вынікам у 1131,6 тысячы тон збожжа. Замыкае тройку лідараў Гродзенская вобласць з паказчыкам у 897,6 тысячы тон. Найбольшая ўраджайнасць сёння назіраецца, дарэчы, таксама на Гродзеншчыне — 44,3 ц/га. А калі гаварыць у прыватнасці аб Гродзенскім раёне, то ўраджайнасць тут перавышае адзнаку ў 75 ц/га. Па працэнтных суадносінах убраных пасяўных плошчаў першае месца займае Брэсцкая вобласць — 91,7%.

Неабходна адзначыць і тое, што, паводле інфармацыі камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Віцебскага аблвыканкама, да сяўбы азімага рапсу ўжо прыступілі гаспадаркі ўсіх раёнаў вобласці. Работы пачынаюць выконваць масава. Пасяўныя запланавана правесці на 50 тыс. га. Паводле аператыўных звестак на раніцу 14 жніўня, каштоўнай алейнай культурай ужо засеяна практычна 12% ад агульнай колькасці плошчаў.

Ілья КРЫЖЭВІЧ. *Kryzhevich@zviazda.by*

АЦАЛІ МЯНЕ, КРЫНІЦА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Тут заўсёды шмат ахвотных далучыцца да таінства, прыняць удзел у хросным ходзе, асвяціць мёд, лекавыя травы, моркву, мак. А яшчэ — дакрануцца да вялікага каменя, які, паводле прыгожай легенды, крышачку не дакінуў каханы прыгажуні Кацярыны з тутэйшага племені асілкаў у спаборніцтве за яе руку. І дзяўчына, замест таго каб выйсці замуж за саперніка, ператварылася ў крыніцу, якая дагэтуль радуе людзей. Кажуць, на світанку можна нават убачыць, як каля вады прыгажуня пляце касу. Крыніца вабіць не толькі сваімі казкамі і легендамі, а яшчэ і тым, што тут захавалася тая спрадвечная прыгажосць, якая існавала стагоддзі таму. Унікальнасць прыроды і крыніцы (яна лічыцца эталонам чысціні падземных вод) спрыяла таму, што тут паявіўся Цэнтр экалогіі крынічнай вады і вядуцца работы па стварэнні заказніка.

Свята Макаўе дае магчымасць адчуць сувязь пакаленняў, захапіцца тым, наколькі багатае і цудоўнае наша мінулае. Яго здабыткі ўжо каторы год папулярызуюць слаўгарадскія сыраробы, якія вырабляюць свае прысмакі па старадаўніх рэцэптах. Іх сыры, а таксама смачны сёлетні мёд і шмат чаго не менш карыснага і гаючага можна было пакаштаваць і набыць на гэтым свяце. Каля 50 тысяч чалавек, якія наведалі яго, зарадзіліся здароўем і эмоцыямі на цэлы год. А налета Блакітная крыніца зноў чакае вас у госці.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*
Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Здарэнні

Пенсіянер ехаў без... задняга кола

Такі выпадак адбыўся ў сталіцы. Удзень 70-гадовы мінчанін спрабаваў дабрацца з вёскі дадому на легкавіку без задняга кола.

«Фольксваген Гольф» рухаўся па вуліцы Радыяльнай з тэхнічнай няспраўнасцю — без задняга правага кола. Заўважыўшы задымленне, супрацоўнікі ДАІ Заводскага РУУС сталіцы спынілі аўтамабіль. Па словах кіроўцы 1947 года нараджэння, ён вяртаўся ў Мінск з вёскі, у дарозе ў яго прабіла кола. Ён паклаў яго на задняе сядзенне, а сам вырашыў прадоўжыць рух. А пасля высветлілася, што мужчына ўвогуле не мае права вадзіць машыну, паколькі не прыгодны да кіравання транспартнымі сродкамі па медыцынскіх паказчыках. Машыну даставілі па месцы жыхарства кіроўцы эвакуатарам.

Мужчына загінуў на палігоне

Адбылося гэта трагічнае здарэнне ў Асіповіцкім раёне.

Мужчыну, жыхару Асіповіч, быў 31 год. У мясцовасці пад назвай Рэпішча, якая з'яўляецца ваенным палігонам і дзе праводзіць вучэбныя стрэльбы вайсковая часць, ён знаходзіўся разам з роднымі: з сынам і братам. Гэта пры тым, што па перыметры палігона маюцца знакі аб закрыцці ўваходу і ўезду на яго тэрыторыю. Грэбаванне гэтымі патрабаваннямі можа прывесці да трагічных наступстваў. Што ўласна і адбылося: па шляху руху мужчыны спрацавала невядомае выбуховае ўстройства...

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

■ Пытанне — адказ

Устаноўленая мінімалка — гэта з падаткамі ці «чыстымі»?

У рэдакцыю «Звязды» даслала ліст Алена Аляксандраўна Стома з вёскі Мікалаеўшчына Стаўбцоўскага раёна. Наша чытачка піша, што ўжо не першы год выпісвае нашу газету і рэкамендуе яе сваім знаёмым. Заўважыўшы, што ў «Звязду» паступаюць розныя пытанні ад чытачоў, задае і свае, якія яе хвалююць.

Вось яны: першае — у нашай краіне ўстаноўлена мінімальная зарплата. На сённяшні дзень гэта 265 рублёў. Гэта з падаткамі ці «чыстымі»? То-бок, на рукі чалавек павінен атрымаць не менш за 265 руб. за поўны месяц ці яшчэ могуць вылічыць падаткі, і выйдзе меншая сума? І другое пытанне: хацелася б ведаць пералік прадуктаў і другіх тавараў, якія ўваходзяць у пражытковы мінімум.

З гэтым лістом мы звярнуліся ў камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага аблвыканкама. На днях рэдакцыя атрымала адказ за подпісам намесніка старшыні камітэта А.Л. Помазавай.

З дадзенага адказу вынікае, што згодна з Працоўным кодэксам нашай краіны велічыня мінімальнай заработнай платы ўключана ў сістэму дзяржаўных гарантый. А калі дакладней, то мінімальная заработная плата (месячная і пагадзінная) — гэта дзяржаўны мінімальны сацыяльны стандарт у галіне аплаты працы пры выкананні ўстаноўленай (месячнай або пагадзіннай) нормы працы.

Згодна з пастановай Савета Міністраў ад 27.12.2016 года №1080 «Аб устанаўленні памеру месячнай мінімальнай заработнай платы» мінімальная месячная заработная плата ўстаноўлена ў памеры 265 рублёў.

Разам з тым Падатковым кодэксам і Законам Рэспублікі Беларусь аб пенсійным забеспячэнні вызначаны абавязковыя ўтрыманні з атрыманых даходаў фізічных асоб. У тым ліку гэта датычыцца і налічанай заработнай платы (і мінімальнай заработнай платы): з яе ўтрымліваецца падаходны падатак (13%) і страхавыя ўнёскі ў Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва (1%).

Такім чынам, паважаная Алена Аляксандраўна, з налічаных 265 рублёў яшчэ павінны быць утрыманы неабходныя падаткі.

* * *

Што датычыцца другога пытання нашай чытачкі, то, як паведамляецца ў лісце з камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага аблвыканкама, бюджэт пражытковага мінімуму (БПМ) як сацыяльны нарматыў прызначаецца для аналізу і прагназавання ўзроўню жыцця насельніцтва, аказання дзяржаўнай сацыяльнай дапамогі малазабяспечаным грамадзянам (сем'ям) і абгрунтавання мінімальных дзяржаўных сацыяльна-працоўных гарантый.

Ён разлічваецца для наступных асноўных сацыяльна-дэмаграфічных груп насельніцтва: працаздольнае насельніцтва; пенсіянеры; студэнты; дзеці ва ўзросце да 3 гадоў; ад 3 да 6 гадоў; ад 6 да 18 гадоў; у сярэднім на душу насельніцтва.

З 1 жніўня 2017 года БПМ быў устаноўлены ў памеры 197,57 беларускага рубля ў сярэднім на душу насельніцтва.

Пражытковы мінімум складаецца з мінімальных набораў прадуктаў харчавання для асноўных сацыяльна-дэмаграфічных груп насельніцтва і нехарчовых тавараў і паслуг. Прычым кошт нехарчовых тавараў і паслуг павінен складаць 77% ад кошту мінімальнага набору прадуктаў харчавання.

На наша пытанне аб тым, ці ёсць дакладны пералік прадуктаў і іншых тавараў, якія ўваходзяць у пражытковы мінімум, спецыялісты камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага аблвыканкама адказалі, што гэта не ўваходзіць у сферу іх кампетэнцыі.

Разам з тым яны адзначылі, што мінімальныя наборы прадуктаў харчавання для асноўных сацыяльна-дэмаграфічных груп насельніцтва вызначаны пастановай Савета Міністраў ад 04.09.2014 года №865 «Аб зацвярджэнні пражытковага мінімуму для асноўных сацыяльна-дэмаграфічных груп насельніцтва і Палажэння аб парадку разліку бюджэту пражытковага мінімуму па асноўных сацыяльна-дэмаграфічных групах і ў сярэднім на душу насельніцтва». На жаль, пералік гэтых прадуктаў харчавання займае шмат месца і газета не мае магчымасці перадрукаваць яго на сваіх старонках. Раім вам азнаёміцца з ім самастойна.

* * *

Акрамя таго, у Мінскім аблвыканкаме дадаткова праінфармавалі, што кожнаму, хто мае ў гэтым патрэбу, можа быць прадастаўлена дзяржаўная адрасная сацыяльная дапамога (далей — ДАСД) у выглядзе штомесячнай і (або) аднаразовай сацыяльных дапамог.

ДАСД у выглядзе штомесячнай сацыяльнай дапамогі прадастаўляецца сем'ям і грамадзянам пры ўмове, што іх сярэднедушавы даход па аб'ектыўных прычынах ніжэйшы за найбольшую велічыню бюджэту пражытковага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва (далей — крытэрый патрэбнасці).

Аднаразовая сацыяльная дапамога прадастаўляецца сем'ям (грамадзянам), якія апынуліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, аб'ектыўна парушаючай нармальную жыццядзейнасць пры ўмове, што іх сярэднедушавы даход складае не больш за 1,5 велічыні за крытэрый патрэбнасці (з 01.08.2017 — 296,35 рубля).

Для вызначэння права на гэтыя віды ДАСД сярэднедушавы даход сям'і (або грамадзяніна) разлічваецца за дванаццаць месяцаў, якія папярэднічаюць месяцу звароту.

Для вызначэння права на гэты від дапамогі вы можаце звярнуцца ў органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне ў адпаведнасці з рэгістрацыяй па месцы жыхарства (месцы знаходжання).

Святлана БУСЬКО.
busko@zviazda.by

■ Ах, лета!

Не толькі вогнішча ды лінейка...

У дзіцячых лагерах можна і заробак атрымаць, і кітайскую мову вывучыць

Чацвёртая і пятая змены ў некаторых дзіцячых аздараўленчых лагерах яшчэ працягваюцца, аднак у цэлым летняя кампанія карыснага адпачынку ўжо на фінішы.

Удзельнікамі сёлетняй аздараўленчай кампаніі стануць увогуле больш чым 360 тысяч дзяцей. Штогод каля 30 працэнтаў школьнікаў прымаюць удзел у арганізаваным аздараўленні. На ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы сёлета было выдаткавана ў тры разы больш сродкаў, чым летась.

Кансультант упраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь Ларыса ЕМЯЛЬЯНЧЫК падкрэслівае, што акцэнт у сёлетняй аздараўленчай кампаніі зроблены на адукацыйнай, сацыяльна значнай дзейнасці, выросла колькасць профільных змен і атрадаў — у першую чаргу для падлеткаў 14—18 гадоў. Калі ў 2012 годзе толькі 10 тысяч дзяцей наведалі лагеры з пэўным профілем дзейнасці, то сёння іх ужо ў чатыры разы больш.

Папулярнасцю карыстаюцца палатачныя лагеры, лінгвістычныя, «Юны эколаг», «Юны археолаг» ды іншыя. У апошнія гады актыўна разгортваюцца летнія лагеры працы і адпачынку, дзе пабывалі ўжо каля 15 тысяч дзяцей. Дарэчы, у працоўных лагерах дзецям удаецца зарабіць ад 100 да 200 рублёў. У лагеры з кругласутачным знаходжаннем усё больш прыязджае (у суправаджэнні бацькоў) дзяцей з асаблівасцямі развіцця — усяго каля 3 тысяч. У аплаце пуцёвак для бацькоў у такіх сітуацыях удзельнічаюць мясцовыя бюджэты. 86 дзяцей наведалі разам з бацькамі пансіянат «Зорны» ў Радашковічах, дзе створана безбар'ернае асяроддзе, а таксама санаторый «Пралеска», дзе ўпершыню маглі адпачываць дзеці з такім захворваннем, як гемафілія, што дагэтуль было проціпаказаннем.

Актыўна развіваюцца ў рэгіёнах і спартыўна-аздараўленчыя лагеры, дзе пабывала за гэта лета каля 70 тысяч чалавек. Аздараўленне атрымала каля 9 тысяч сірот. А 2,5 тысячы дзяцей з рэгіёнаў, пацярпелых ад аварыі на ЧАЭС, атрымалі пуцёўкі бясплатна. У кругласутачных лагерах сярэдні кошт пуцёўкі па краіне склаў 380 рублёў, у дзённых — 90. Палова кошту ў кругласутачных лагерах аплачваецца з дзяржаўнага бюджэту.

Фота Надзеі БУЖАН.

На лагер «Патрыёт», які дзейнічае вось ужо некалькі гадоў на базе аздараўленчага цэнтра для маладых інвалідаў, накіроўваюцца сродкі з мясцовага бюджэту. Лагер патрабуе асаблівага педагагічнага суправаджэння. Тут распрацоўваецца разам з прадстаўнікамі вайсковых часцей змястоўная праграма. Аздараўленчы цэнтр «Зорны» прымае не толькі дзяцей з парушэннямі апорна-рухальнага апарату, але з нядаўняга часу і з цукровым дыябетам, сардэчна-сасудзістай паталогіяй. Такіх дзяцей не толькі прыцягваюць да цікавых заняткаў, але і забяспечваюць ім адпаведнае медыцынскае суправаджэнне. Адукацыйна-аздараўленчы цэнтр «Лідар» сёлета правёў змены для лепшых атрадаў, якія нясуць варту на плошчы Перамогі каля Вечнага агню ў сталіцы, а ў хуткім часе сюды завітае група школьнікаў Вільнюскай гімназіі імя Ф. Скарыны.

— Гэтым летам мы аздаровім больш як 6 тысяч дзяцей, а на працягу года дзесьці каля 16 тысяч чалавек, — паведамляе **дырэктар Нацыянальнага дзіцячага адукацыйна-аздараўленчага цэнтра «Зубраня» Надзея АНУФРЫЕВА.** — Для дзяцей, якія дасягнулі поспеху ў сацыяльна значнай дзейнасці, пачалася апошняя, пятая, змена працягласцю 18 дзён. У ёй удзельнічаюць пераможцы міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд. Сёлета ў нас з'явіўся лагер «Зубраняцкія дачы» — драўляныя домікі, у якіх адпачываюць у тым ліку дзеці з асаблівасцямі развіцця ў суправаджэнні бацькоў. Наогул «Зубраня» дзеліцца на пяць лагераў — «Блакітны», «Зорны», «Вясёлкавы», «Зубраняцкія дачы» і палатачны лагер «Ружа вятроў». «Вясёлкавы», напрыклад, спецыялізуецца на спартыўных і міжнародных праектах. Палатачны дазваляе арганізаваць вывучэнне кітайскай і англійскай моў, займацца даследчай дзейнасцю — разам са спецыялістамі БДУ дзеці вывучаюць прыроду Нарачанскага краю. Актыўна працуе ў нас і турысцка-экскурсійны аддзел — школьнікі выязджаюць у Мір, Нясвіж, Полацк, Мінск...

«Зубраня», дарэчы, дадаткова прадастаўляе медыцынскія паслугі. Пасля сёлетняй дзяржаўнай атэстацыі цэнтр можа быць пераведзены ў шэрагі санаторна-курортных арганізацый. Усяго па краіне 12 дзіцячых рэабілітацыйных цэнтраў, што займаюцца санаторна-курортным лячэннем і аздараўленнем дзяцей, якія пражываюць на тэрыторыях, пацярпелых ад аварыі на ЧАЭС. Круглы год такія цэнтры прадастаўляюць поўны комплекс медыцынскіх паслуг і навучанне. Праўда, адукацыйны працэс нідзе не наладжаны так добра, як у «Зубраняці».

Дарэчы, да 8 працэнтаў дзяцей тут — замежнікі. Сёлета «Зубраня» наведалі дзеці з 41 краіны свету, у тым ліку з такіх далёкіх, як Індыя і ЗША. Традыцыйна добрыя сувязі падтрымліваюцца з Вільнюсам і Рыгай. Вось толькі што завяршылася змена для японскіх дзяцей, якія пацярпелі ад прыродных бедстваў.

З 14 па 28 жніўня на базе лагераў «Крынічка» і «Зубраня» пройдуць аздараўленне 40 сірыйскіх дзяцей ва ўзросце ад 8 да 14 гадоў у суправаджэнні чатырох кіраўнікоў групы. Дзеці — з ліку сірот, з прытулкаў, некаторых трымалі разам з бацькамі ў палоне. Нашаму боку давялося глыбей пазнаёміцца з асаблівасцямі сірыйскага менталітэту, арабскай кухняй, каб стварыць максімальна камфортныя ўмовы для іх размяшчэння. Запланавана пяць экскурсій з перакладчыкамі, азнаямленне з беларускай кухняй. Акрамя таго, дзяцей абследуюць у Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы і згодна са станам свайго здароўя яны атрымаюць санаторна-курортнае лячэнне. На базе «Зубраняці» ўжо другі год дзейнічае медыцынскі цэнтр з бальнеалагічнай, фізіятэрапеўтычнай, стаматалагічнай лячэбнай дапамогай. Цэнтр будзе прымаць сірыйскіх дзяцей як за ўласныя сродкі, так і за спонсарскія.

Беларускія дзеці таксама выязджаюць за межы — наша краіна мае свае санаторна-курортныя арганізацыі ў Друскінінкаі, Сочы, Туапсэ, Міхоры, куды накіроўваюцца ў тым ліку арганізаваныя групы за кошт бюджэтных сродкаў. На міжнароднае аздараўленне накіроўваюць дзяцей-сірот і розныя міжнародныя фонды. Так, у Італію за паўгода выехалі на адпачынак каля 1800 нашых дзяцей. Невялікія групы едуць таксама ў Балгарыю і нават Японію.

Святлана БАРЫСЕНКА. *protas@zviazda.by*

БЕЛАРУСБАНК

ОАО «АСБ Беларусбанк» информирует вкладчиков об изменении процентных ставок по срочным банковским вкладам в белорусских рублях

С 15.09.2017 по ранее открытым срочным банковским вкладам в иностранной валюте устанавливаются:

- **«Классик плюс»** (в долларах США, евро), по которым не начисляется пониженная процентная ставка:

открытым до 13.11.2015 – проценты в размере 1,1% годовых;

открытым с 13.11.2015 до 01.04.2016 – проценты в размере 1,7% годовых.

- **«Классик Безотзывный»** (в долларах США, евро), по которым не начисляется пониженная процентная ставка, проценты в размере 2% годовых.

- **«Ваш выбор»** (в долларах США, евро), по которым не начисляется пониженная процентная ставка, основные проценты в следующих размерах:

для ежедневного остатка вклада до 2000 (включительно) – 0,1% годовых;

для ежедневного остатка вклада более 2000–15000 – 0,4% годовых;

для ежедневного остатка вклада более 15000 – 0,7% годовых.

- **«Сберегательный»** (в долларах США, евро), по которым не начисляется пониженная процентная ставка, проценты в размере 1,2% годовых.

С 15.09.2017 по действующим срочным банковским вкладам в иностранной валюте, открытым до 15.08.2017, устанавливаются процентные ставки в следующих размерах:

- **«Классик Отзывный до года»** (в долларах США, евро):
на срок 185 дней – 0,5% годовых.

- **«Классик Безотзывный до года»** (в долларах США, евро):
на срок 6 месяцев – 1,1% годовых;
на срок 9 месяцев – 1,6% годовых.

- **«Классик Отзывный свыше года» на срок 18 месяцев** (в долларах США, евро) – 1,8% годовых.

Установленный размер процентов применяется к вышеуказанным срочным банковским вкладам, по которым не нарушена срочность.

Подробности по телефону 147, на корпоративном сайте и в отделениях «Беларусбанка»

Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.
Лицензия на осуществление банковской деятельности №1 от 24.05.2013, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

Процентная ставка по вкладам (депозитам) может быть изменена банком в одностороннем порядке в соответствии с договорами банковских вкладов (депозитов)

Извещение о проведении аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	Червенское районное потребительское общество

Предмет аукциона

Наименование	Назначение	Общая площадь	Инвентарный номер	Адрес
Магазин №59	Здание специализированное розничной торговли	64 кв. м	615/С-36055	Минская обл., Червенский р-н, г. Червень, ул. Горбачева, д. 67

Составные части и принадлежности: склад, котельная, терраса

***Сведения о земельном участке**:* пл. 0,0226 га, предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания магазина №59

Начальная цена с НДС 20% – 17 686,00 бел. руб.

Задаток 10% от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, г. Минск, ул. Коллекторная, 11 БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи — **10** рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время проведения аукциона	**19.09.2017** в 11.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Дата и время окончания приема документов	**18.09.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Контактные телефоны	**+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@cpo.by**

Управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома объявляет о проведении торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Лепельагросервис» (УНП 300590110)

Наименование (описание) имущества и его стоимость	Лот №1. Капитальное строение с инвентарным номером 230/С-13213, площадь – 3188,5 кв. м, назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей, стоимость 57 100 белорусских рублей
Наличие обременений	Отсутствуют
Местонахождение имущества	г. Лепель, ул. Партизанская, 13А/9
Место, дата и время проведения торгов	30.08.2017 г. в 10.00 г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.4
Справочная информация об организаторе торгов	Управление принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома (г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1 www.vitebskjust.gov.by). Судебный исполнитель: Атрахимович Николай Александрович, тел./факс (80212) 610424, (8033) 6879162
Условия и порядок проведения торгов	Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано: 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет управления принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома IBANBY73AKBB36429030010372000000 в ф-ле 200 ОАО «АСБ Беларусбанк», BICAKBBBY21200, УНП 300002505, не позднее 15.00 29.08.2017 г. Величина первого шага составляет 5 процентов начальной стоимости выставленного на торги имущества (лота). В соответствии со статьей 97 Закона Республики Беларусь «Об исполнительном производстве» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги (покупателем)

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельское конструкторское бюро «Луч» (продавец) извещает о проведении 31 августа 2017 года открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

№ лота	Наименование имущества	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20%), бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20%), бел. руб.
1	**Незавершенное законсервированное капитальное строение с инв. № 350/U-173907**, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **здание неустановленного назначения, площадью 10 719,9 кв. м.** Адрес: г. Гомель, ул. Объездная, д. 7/8. Степень готовности – 51%. Количество надземных этажей – 3-9. Информация о земельном участке: объект расположен на земельном участке с кадастровым номером **340100000007006192** общей площадью **0,6695 га** – для обслуживания незавершенного строительством (корпус №1, блок №1). **Право постоянного пользования**. Местонахождение: **г. Гомель, ул. Объездная, д. 7**	**8 409,83**	84,10

Продавец: ОАО «Гомельское конструкторское бюро «Луч», г. Гомель, ул. Объездная, д. 7. Конт. тел.: 8 (0232) 43-52-97 – Кузьменко Татьяна Геннадьевна. **Шаг аукциона – 5%. Для участия в аукционе необходимо: 1)** оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Гомельское конструкторское бюро «Луч»):** р/с № BY52BPSB30121118860129330000 в РД №300 по Гомельской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 400068368, назначение платежа – задаток за участие в аукционе; **2)** подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 15 августа 2017 г**. по адресу: ул. Гагарина, 20, г. Гомель в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 29 августа 2017 г. в 16.00. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.**

Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять)%**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **20 (двадцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Подробное извещение опубликовано в газете «Белорусская Нива» («Сельская газета») от 09.08.2016 г. №91 (20770).**

Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: 8 (0232)23-23-54, 23-23-56 и на сайте gomeloblreklama.by

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Мозырьагропромснаб» (продавец) извещает о проведении 31 августа 2017 года открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20%), бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20%), бел. руб.
1	**Капитальное строение с инв. № 330/С-25115,** назначение – сооружение специализированное транспорта, наименование **– стоянка (инв. №217), общей площадью 0,0 кв. м,** общая площадь застройки – **5 389,0 кв. м,** площадь части с покрытием **– 2 986,0 кв. м,** ввод в эксплуатацию – 01.12.2000 г. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **323500000001000006** площадью **0,5389 га** – для обслуживания стоянки. **Местонахождение:** Гомельская область, Мозырский р-н, Р-31, 161-й км	**38 400,00**	3 840,00

Продавец: ОАО «Мозырьагропромснаб», Гомельская область, Мозырский р-н, д. Козенки, ул. Спортивная, 77А. Конт. тел.: 8 (0236) 23-22-47. **Шаг аукционных торгов – 5%. Для участия в аукционе необходимо: 1)** оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Мозырьагропромснаб»):** р/с BY28SLAN30121124300190000000 в ЗАО «Банк ВТБ», г. Минск РД №10, BIC SLANBY22, УНП 490803594, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах; **2)** подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 15 августа 2017 г**. по адресу: ул. Гагарина, 20, г. Гомель в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 29 августа 2017 г. в 16.00. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Подача документов по почте не допускается.**

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** торгов в течение **5 (пяти)** рабочих дней со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи либо в **течение 15 (пятнадцать) рабочих дней** с момента подписания договора купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение **3 (трех)** рабочих дней с момента подписания протокола. **В стоимость лота входят расходы, связанные с оценкой имущества.** Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Подробное извещение опубликовано в газете «Белорусская Нива» («Сельская газета») от 27.04.2017 г. №48 (20880).**

Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 23-23-53 и на сайте gomeloblreklama.by

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Сахарторг» (продавец) извещает о проведении 30 августа 2017 года открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

№ лота	Наименование имущества	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20%), бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20%), бел. руб.
1	**Незавершенное законсервированное капитальное строение с инв. № 350/U-169494, площадью 1 176,4 кв. м**, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **незавершенное законсервированное капитальное строение.** Адрес: г. Гомель, ул. Чечерская, д. 42А. Степень готовности – 75%. **Информация о земельном участке:** объект расположен на земельном участке с кадастровым номером **340100000002004549** общей площадью **0,0894 га** – для строительства магазина продовольственных товаров. **Право аренды**. Местонахождение: **г. Гомель, ул. Чечерская (микрорайон №21).** **Информация о земельном участке:** объект расположен на земельном участке с кадастровым номером **340100000002005356** общей площадью **0,0297 га** – для строительства магазина продовольственных товаров (участок №1). **Право аренды**. Местонахождение: **г. Гомель, ул. Чечерская (микрорайон №21).** **Информация о земельном участке:** объект расположен на земельном участке с кадастровым номером **340100000002005357** общей площадью **0,0072 га** – для строительства магазина продовольственных товаров (участок №2). **Право аренды**. Местонахождение: **г. Гомель, ул. Чечерская (микрорайон №21)**	1 140 384,00	57 019,20

Продавец: ОАО «Сахарторг», г. Гомель, ул. Могилевская, д. 1а, конт. тел.: 8 (0232) 21-00-34 – Землянская Виктория Викторовна. **Шаг аукциона – 5%.**

Для участия в аукционе необходимо:

1) оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Сахарторг»):** р/счет BY67BLBB30120400078372001001 Дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, г. Гомель, ул. Советская, 7, IBAN: BLBBBY2X, УНН 400078372, ОКПО 28834675, **назначение платежа** – задаток за участие в аукционе лот №1.

2) подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 15 августа 2017 г**. по адресу: ул. Гагарина, 20, г. Гомель в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 28 августа 2017 г. в 16.00. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.**

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**.Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** торгов в течение **5 (пяти)** рабочих дней со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **30 (тридцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Подробное извещение опубликовано в газете «Белорусская нива» («Сельская газета») №63 (20895) от 06.06.2017 г.**

Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, на сайте gomeloblreklama.by

РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) по поручению ОАО «Западэлектросетьстрой» (Продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже базы отдыха «Берег», расположенной по адресу: Украина, Николаевская обл., Очаковский р-н, с. Черноморка, ул. Костенко, 77/1.

Земельный участок площадью 1,1018 (кадастровый номер 4825184801:04:022:0004) передан ОАО «Западэлектросетьстрой» в аренду по договору аренды земли от 13.09.2006 №040602100101, соглашение о продлении договора аренды земли от 10.10.2014 №040602100101 на 10 (десять) лет.

Начальная цена без НДС – 7 000 долларов США. Задаток – 700 долларов США. Шаг аукциона – 5%.

Валюта торгов – доллар США. Валюта платежа – доллар США, российский рубль или белорусский рубль по курсу Национального банка Республики Беларусь.

Задаток перечисляется в белорусских рублях: р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», BIC банка BPSBBY2X, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а.

Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже имущества ОАО «Западэлектросетьстрой», проводимом 31 августа 2017 г.

К участию в аукционных торгах допускаются индивидуальные предприниматели, физические и юридические лица без ограничения, вне зависимости от государственной принадлежности, внесшие задаток по 30.08.2017 до 11.00 по белорусскому времени. В качестве участника аукциона регистрируются лица, задаток которых поступил на расчетный счет Организатора аукциона на момент подачи заявления на участие в аукционе с иными необходимыми документами.

Аукцион состоится 31.08.2017 г. в 14.00 по белорусскому времени по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений – 30.08.2017 в 11.00 по белорусскому времени.

Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 01.10.2014. С полным текстом извещения можно ознакомиться на сайте Организатора аукциона ino.by

☎ Организатор аукциона: 8 10 375 (17) 306-00-57, 8 10 375 (29) 356-90-03, 8 10 375 (29) 550-09-52 ● www.ino.by ● e-mail: torgi@ino.by

Управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома объявляет о проведении торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Жукнево» (УНП 300011620)

Наименование (описание) имущества и его стоимость	Лот №1. Автомобиль «Шевроле Нива» 212300, 2008 г. в., гос. №4912 BI2, состояние условно-пригодное – начальная цена 1 497,00 рубля
Наличие обременений	Отсутствуют
Местонахождение имущества	Толочинский р-н, д. Жукнево
Место, дата и время проведения торгов	29.08.2017 г. в 10.00 г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.4
Справочная информация об организаторе торгов	Управление принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома (г. Витебск, ул.Б.Хмельницкого, 10/1 www.vitebskjust.gov.by). Судебный исполнитель: Атрахимович Николай Александрович, тел./факс (80212) 610424, (8033) 6879162
Условия и порядок проведения торгов	Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано: 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет управления принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома IBANBY73AKBB36429030010372000000 в ф-ле 200 ОАО «АСБ Беларусбанк», BICAKBBBY21200, УНП 300002505, не позднее 15.00 28.08.2017 г. Величина первого шага составляет 5 процентов начальной стоимости выставленного на торги имущества (лота). В соответствии со статьей 97 Закона Республики Беларусь «Об исполнительном производстве» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги (покупателем)

■ Рэха падзеі

«ЧЫТАЛА, ЧЫТАЮ І БУДУ ЧЫТАЦЬ. ТАК ТРЫМАЦЬ НАДАЛЕЙ!»,

або Кароткі агляд лістоў, якія «Звязда» атрымала з нагоды свайго стагоддзя

Што было — было: на Століншчыне, расказвалі, у адной хаціне стагадовы юбілей спраўлялі. У госці да гаспадыні цэлая грамада сабралася: дзеці з жонкамі-мужамі, унукі з сем'ямі, праўнукі, прапраўнукі... Распачаў бяседу старэйшы з сыноў. Сказаў, што рады быць у роднай хаце, рады бачыць сваю матулю бадзёрай і вясёлай, што ўдзячны ёй за ўсё...

Ну і далей, што гэта проста цуд сабрацца разам!

— Дык вып'ем жа за тое, — дайшоў да тоста ён, — каб соты дзень твайго нараджэння, дарагая мамачка, не быў апошнім, каб налета мы зноў цябе віншавалі...

Уся радня, слухаючы гэта, згодна ківала, а на апошніх словах устала з месцаў і памкнулася да імянінніцы, каб чокнуцца...

Сядзець засталася толькі нявестка, якая амаль усё жыццё пражыла разам са свякроўкай:

— Не ведаю, як вы, — сказала яна, — а я за гэты тост піць не буду.

На звяздоўскім стагоддзі такіх выступоўцаў, вядома ж, не было: шмат лістоў-віншаванняў мы паспелі падрыхтаваць да друку, змясціць у святочным выпуску, але ж многія прыйшлі пазней, калі нумар ужо быў падрыхтаваны. А таму, хоць коратка, хоць праз коску, як той казаў...

«Газету я выпісваю з 1990 года, — піша **настаўніца беларускай мовы і літаратуры сталічнай гімназіі №25 спадарыня Аліна ПАХВАЛЁНАЯ.** *— «Звязда» дапамагла мне стварыць музей і, дзякуючы пастаяннай рубрыцы «Простыя рэчы», якую вёў Алесь Касцень, падрыхтаваць нямала экскурсавод аў, знаўцаў народнага побыту.*

Я сама родам з вёскі Сноў Нясвіжскага раёна, — працягвае Аліна Казіміраўна, *— і таму з любоўю захоўваю нумары «Звязды» пра сваю малую радзіму, яе жыхароў (у тым ліку — маю сястру Марыну Лігар), пра наш агракамбінат. Анатоль Кляшчук неаднойчы бываў у нас, працуючы над фотаальбомам «Беларусь. Зямля песняроў» (на бровары ў Дольным Снове працаваў Янка Купала).*

У гімназіі, з аўтографамі, ёсць і хроніка-дакументальная кніга «Нашчадкі вогненных вёсак» звяздоўскай журналісткі Таццяны Падаляк, і зборнікі «Фотаслоў» Яўгена Пясецкага, «Простай мовы»...

Такім чынам, газета з'яўляецца для нас універсальнай крыніцай ведаў, дзе кожны можа знайсці нешта патрэбнае для сябе і сам падзяліцца думкамі. Для мяне, як настаўніцы, вельмі карысная ўкладка «Чырвоная змена», ды і «Звязда» наогул, як газета, якая дапамагае захоўваць родную матчыну мову».

«...Мне вельмі цікава чытаць па-беларуску, — піша **Васіль Дудко з Бабруйска,** *— а хацелася б яшчэ і бачыць, чуць нашу першую дзяржаўную ў паўсядзённым жыцці. Шкада, што гэтага амаль няма, што вельмі многія беларусы, і я ў тым ліку, ужо развучыліся размаўляць па-беларуску... Маем, як быццам, права: у нас двухмоўе. Але, на мой погляд, мова ў дзяржаве, як і ў сям'і, павінна быць адна, агульная для ўсіх. А пакуль гэтага няма, —* працягвае спадар Васіль, *— я з задавальненнем чытаю «Звязду» і знаходжу ў ёй усё: навіны, падказкі і парады спецыялістаў, юрыдычныя кансультацыі, гумар... Так трымаць!»*

«Звязду» я выпісваю і чытаю з 1960 года, хоць для мяне яна і дарагаватая, — прызнавалася **Вера Яфімаўна Клімовіч са Стаўбцоўшчыны.** *— Людзі ў нашай вёсцы выбіраюць таннейшыя газеты. Я таксама некалі казала свайму гаспадару (светлай памяці!), што, можа, і мы што дзяшовае выберам? А ён пытаўся тады: «Ну і што ў тых газетах будзем чытаць?» І сапраўды — не праграму ж тэлеперадач?»*

Кажуць, што газета жыве адзін дзень. Няпраўда. Доказам таму ці не ўся юбілейная пошта. І згаданы ліст са Стаўбцоўшчыны — у прыватнасці. *«Разам са звяздоўцамі я сумавала па тых журналістах, тых аўтарах, якія пайшлі з жыцця, —* пісала Вера Яфімаўна. *— Асабліва перажывала за Уладзіміра Гойтана. У мяне па сёння ляжыць газета з яго апошняй публікацыяй, з расказам, як ён трапіў у чарнобыльскую зону, як атрымаў там хваробу. Моцна перажывала я і за Ніну Захарэвіч з Пастаў. Маладая ж яшчэ, разумніца, прыгажуня... «Звязда» з развітальнымі словамі таксама ў маіх архівах...»*

«...Журналістаў газеты заўсёды вылучала асаблівая шчырасць, высокае пачуццё адказнасці перад чытачамі і грамадствам у цэлым, вернасць традыцыям і свой непаўторны стыль, — піша ў вітальным лісце **старшыня Федэрацыі прафсаюзаў, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Міхаіл ОРДА.** *— З вашай газетай непарыўна звязана жыццё некалькіх пакаленняў, якія заўсёды шанавалі і шануюць «Звязду» за прафесіяналізм і аб'ектыўнасць. Для многіх нашых суайчыннікаў ваша выданне — не проста крыніца навін, а сапраўдны аднадумец і цікавы, уважлівы суразмоўнік. За гэтыя гады на старонках газеты знайшлі адлюстраванне лёсы і гісторыі тысяч нашых людзей. Асаблівую ўдзячнасць хачу выказаць калектыву выдання за пастаянную ўвагу да патрэб чалавека працы, а таксама за тое, што ўсе гэтыя гады вы цесна супрацоўнічаеце з прафсаюзамі і тым самым садзейнічаеце павышэнню абароны правоў працаўнікоў».*

Шмат цёплых слоў у віншаваннях **дзяржаўнага сакратара Саюзнай дзяржавы Георгія РАПОТЫ, Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Беларусь у Венгрыі Аляксандра ХАЙНОЎСКАГА, Выканаўчага камітэта Садружнасці Незалежных Дзяржаў, першага намесніка міністра інфармацыі І. У. ЛУЦКАГА, старшыні Гомельскага аблвыканкама У. А. ДВОРНІКА, старшыні Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі В. У. НАЗАРАНКІ, першага намесніка генеральнага дырэктара ААТ «Белкніга» Г. А. СІЛІНСКАГА, дырэктара ААТ «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа» І. М. МАЛАНЯКА, рэктара гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта А. Д. КАРАЛЯ, калектыву прадпрыемства «Гроднаблсаюздрук», выдавецтваў «Народная асвета», «Мастацкая літаратура»...**

«...Нам прыемна, — піша, у прыватнасці, **генеральны дырэктар РУП «Белпошта» Уладзімір МАТУСЕВІЧ**, *што на працягу многіх гадоў з рэдакцыяй газеты «Звязда» нас злучаюць трывалыя дзелавыя і сяброўскія адносіны. Мы высока цэнім наша ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва і спадзяёмся на яго далейшае канструктыўнае развіццё, пабудаванае на даверы і ўзаемаразуменні. Шчыра жадаю ўсім супрацоўнікам «Звязды» новых творчых ідэй і дасягненняў, дабрабыту і поспеху ў рэалізацыі самых смелых планаў!»*

Тэлеграмы, прыгожыя віншавальныя паштоўкі, лісты, тэлефонныя званкі... вядома ж, — і ад нашых чытачоў: *«Віншую... Чытала, чытаю і буду чытаць. Так трымаць надалей!* — пажадала **Сафія Лубінская з г. п. Свір**; *«Колькі ў небе зор — нельга палічыць, але ты, «Звязда», для мяне гарыш», —* прызнавалася **Ніла Міхайлаўна Русак з Дзяржынска** і ў якасці пажадання дадавала толькі адно: «заўжды заставацца такімі ж шчырымі ды светлымі. І... свяціць!»

Чаго яшчэ нам жадалі (падпісчыкі «Звязды» з такіх далёкіх пяцідзясятых, шасцідзясятых гадоў мінулага стагоддзя ветэран Вялікай Айчыннай Міхаіл Трафімавіч Чарняўскі з Мядзельшчыны, Анастас Лявонцьевіч Семяновіч з прысталічных Бараўлян, Эмілія Васілевіч, Іна Казлоўская і Уладзімір Голубеў з Мінска, Радзіён Шпец з Шаркаўшчыны, Валянціна Гудачкова з Жыткавічаў і Аляўціна Рабцава з Міншчыны і многія, многія іншыя) пералічыць цяжка: здароўя, натхнення, плёну ў працы на карысць радзіме, грошай, спонсараў, ідэй, цікавых суразмоўнікаў і камандзіровак, росту тыражоў...

«З персанальным стагоддзем, звяздоўцы! Больш за чвэрць у яго — і маё, чым ганаруся і шчыра дзякую ўсім, з кім дружна і творча працавалася, — «тэлеграфавала» 9 жніўня наша незабыўная каляжанка, **намесніца галоўнага рэдактара «Звязды» Людміла Іванаўна РЫЖАНКОВА.** *— Здароўя вам, смеласці і моцы — каб «Звязда» са сваімі славутымі традыцыямі і далей была першай на вызначальных паваротах нашай гісторыі. Нехай вам у радасць будзе служэнне адзіна вартаму — УЛАСНАМУ СУМЛЕННЮ і ЛЮБАЙ БЕЛАРУСІ».*

Незвычайнае віншаванне газеце даслалі супрацоўнікі Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы. Пясняр, як вядома, быў шчырым сябрам «Звязды», тут друкаваў свае многія творы. *«Дзякуючы шматлікім публікацыям чытачы атрымлівалі звесткі пра літаратурную і грамадскую дзейнасць Песняра, яго ўклад у развіццё беларускай і сусветнай культуры... Мы рады, —* пішуць супрацоўнікі музея, *— што маем магчымасць павіншаваць найстарэйшую беларускую газету радкамі з верша Янкі Купалы «Звяздзе», які ён напісаў з нагоды выхаду 5000-га нумара:*

Скажам жа ёй шчырае
Наша пажаданне:
Каб жыла, квяцілася
Далей безустанне!»

Не думайце, калі ласка, што паважаныя аўтары трохі памыліліся, што Пясняр жадаў газеце квяцілца безустанн**я**. У Купалы гэтае слова напісана так, як напісана, з літарай **е**. Відаць, тады, у ліпені 1934-га, амаль 90 гадоў таму, пісалі іменна так. Іншымі словамі, мяняюцца часы, людзі, мова, нязменнай застаецца любоў:

Найлепшай, родненькай газеце,
Што матычнаю грэе мовай,
«Звяздзе», звяздоўцам —
даўгалецця!
Няхай яго вялікасць Слова
Жыве пад вашаю рукою,
Бруіць, звініць, пяе крыніцай,
Каб піць з яе і не напіцца
Нам, верным чытачам, ніколі!
Натхнення, творчага запалу
І росту тыражу, вядома,
Каб юбілярка ўрэшце стала
Сваячкаю у кожным доме!

Гэтыя пажаданні — ад шматгадовай падпісчыцы і аўтаркі газеты **Алены Несцяронак з Докшыц.**

...Зрэшты, усе віншаванні працытаваць, пералічыць усё адно не ўдасца. А таму шчыры дзякуй тым, хто не прапусціў наша свята. Усе віншаванні былі, што называецца, у агульным доступе: упрыгожвалі рэдакцыйную дошку аб'яў, адмысловы столік, радавалі вочы і сэрцы...

Як і здымкі з сямейных архіваў. На іх былі звяздоўцы (самых розных пакаленняў) і за работай, і ў час адпачынку...

Такім чынам нам і сапраўды ўдалося ўспомніць усіх (многіх па імёнах ды прозвішчах), чыім клопатам (а то і жыццём!), чыёй працай жыла газета раней і жыве сягоння. *«Юбілей — гэта выдатны час для пачатку новых праектаў і спраў, —* падкрэсліў **начальнік Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслінnага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь С. В. НОВІКАЎ.** *— Упэўнены, што самыя лепшыя, цікавыя матэрыялы яшчэ наперадзе...»*

Мы на гэта спадзяёмся таксама.

Валянціна ДОЎНАР.

dounar@zviazda.by

■ Вестк і з месцаў

АДРОДЗІЦЦА СВЯТА-КІРМАШ!

Са старажытнага абраду, з «Зажынак», сёлета пачалася ўборка ва ўсіх гаспадарках Касцюковіцкага раёна. Багатага намалоту і добрага настрою земляробам пажадалі ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці.

Як кажуць старажылы, кірмашы на Ілью спрадвеку былі ў Саматэвічах. Цяпер на карце раёна няма, на жаль, гэтага мястэчка: пахавалі яго ў зямлі, атручанай чарнобыльскай радыяцыяй. Большасць жыхароў перасяліліся ў Новыя Саматэвічы. Кірмаш застаўся хіба ва ўспамінах...

Ініцыятыву работнікаў раённага Цэнтра культуры адрадзіць яго актыўна падтрымалі супрацоўнікі Новасаматэвіцкага клуба, Бялынкавіцкага сельскага Савета і...

Дзве з паловай гадзіны на спецыяльна абсталяванай плошчы аграгарадка доўжылася свята. Мясцовыя жыхары і госці з райцэнтра з'ехаліся не толькі для таго, каб нешта прыдбаць, — каб акунуцца ў атмасферу свайго дзяцінства і маладосці. На пытанне «Як гэта было раней?» адна з найстарэйшых жанчын Алена Сямёнаўна Шорнікава адказала: «З першых пасляваенных гадоў да нас на Ілью сталі прыязджаць гандляры, прычым не толькі з Беларусі, але і з Бранскай вобласці, з Рослаўля, нават з самога Кіева! Везлі ўсё: свіней, авечак, свойскую птушку, посуд гліняны, вопратку, цукеркі на палачках ды шмат чаго яшчэ. З'язджацца пачыналі з дзвюх гадзін ночы. Месцы займалі, раскладвалі тавар. Са світаннем пачынаўся гандаль. Людзей было — вокам не акінуць... Заўжды ладзіліся канцэрты, атракцыёны. Працаваў тэатр «Батлейка», на хадулях хадзілі скамарохі. Але весялосць пачыналі толькі тады, як людзі з палёў вярталіся, бо менавіта ў гэты дзень (на Ілью) пачыналі жніво: зжынялі некалькі палос і спынялі работы да заўтра, бо трэба ж на кірмаш...

Запомніўся і гандаль гармонікамі. Яны тут на любы густ былі. А каб прадаць, музыкам трэба было паказаць іх, гэта значыць «урэзаць» нейкую польку ці марш. Вось яны і «ўразалі»...

А нарэшце пачыналіся танцы — у многіх месцах, з гармонікамі, з бубнамі.

Свята грымела з ночы да ночы. «Ходарам хадзіла» ўся вёска. Да «кірмашоў на Ілью» рыхтаваліся, іх чакалі ўвесь год. А потым...

Потым вёску перасялілі. Доўгі час не да вяселля было... Сёння быццам у маладосць, быццам дамоў вярнуліся».

Пахаваным Саматэвічам жыхары збіраюцца паставіць помнік. А пакуль ушаноўваюць найстарэйшага з месцічаў, самага маленькага, як сувязь двух пакаленняў.

І зноў іграюць гармонікі! Да мікрафона можа падысці любы ахвотны: прыпеўкі гучаць — наперабой...

Свята, карацей, удалося, хай не такое, як раней, але пачатак пакладзены. З часам, глядзіш, і адродзіцца вялікі Ільінскі кірмаш, паедуць гандляры і ў Новыя Саматэвічы.

Наталля ДРОБЫШАВА,

г. Касцюковічы

■

ЦАРКВА, КАСЦЁЛ І СІНАГОГА ПА СУСЕДСТВЕ

Зямля, адораная Божай ласкай, якая ў той жа час зведала шмат страт. Мясцовасць з багатай гісторыяй, напоўненай легендамі і паданнямі. Мяняліся часы — змяняліся і мясцовыя традыцыі. Розным было і рэлігійнае жыццё ў Азёрах.

Пасля падпісання ў 1596 годзе Берасцейскай царкоўнай уніі, спрадвеку праваслаўны Азёрскі край стаў пераводзіцца ва ўніяцтва. Царква, якая знаходзілася на паўднёва-ўсходняй ускраіне вёскі побач з могілкамі, на перакрыжаванні вуліц Царкоўнай і Могілкавай (сённяшніх Чырвонапартызанскай і Піянерскай), была ператворана ва ўніяцкую.

У XVII стагоддзі ў вёсцы пачало распаўсюджвацца каталіцтва, быў пабудаваны драўляны касцёл Маці Божай Ружанцовай, знішчаны ў час вайны з Масковіяй 1654—1667 гадах. Тады ж моцнае разбурэнне адчула на сабе ўсё паселішча. Новы драўляны касцёл быў адбудаваны на Рынку ў 1679 годзе. Праз сто гадоў, у 1779-м, праводзілася яго капітальнае аднаўленне на сродкі ўладальніка Азёр караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Двухвежавы храм па задумцы архітэктара з'яўляўся спробаю выкарыстання класіцызму ў драўляным дойлідстве.

Пасля спусташальнай вайны з Масковіяй сярэдзіны XVII стагоддзя ў Азёрах пачалі актыўна сяліцца яўрэі. У паселішчы ўзрастала значэнне гандлю і рамёстваў, у выніку з вёскі яно ператварылася ў мястэчка, якое, на думку гісторыка В. Рагойшы, «выступала як унікальная форма спакойнага, талерантнага прадуцыравання і сужыцця некалькіх нацыянальных культур». Яўрэі ўтварылі моцную, даволі паспяховую абшчыну, якая існавала за кошт мукамольнай прамысловасці, рыбалоўства, дублення скур, рамёстваў і гандлю.

На вуліцы Школьнай, бліжэй да возера, адкрылася яўрэйская школа, адсюль вуліца атрымала сваю назву. Побач у канцы XVIII стагоддзя пабудавалі сціплую па знешнім выглядзе і аздабленні драўляную сінагогу, акружаную па перыметры галерэяй і прыбудовамі. Яна ўяўляла сабою бязвежавае збудаванне прасторнага аб'ёму з высокім дахам складанай канфігурацыі і мела падабенства са шматлікімі ўзорамі сінагагальнай архітэктуры, размешчаных па ўсёй Беларусі, напрыклад у Воўпе, Адэльску і Песках.

Большасць насельніцтва Азёр па веравызнанні былі ўніятамі, пераведзенымі з праваслаўя, і наведвалі невялічкую ўніяцкую царкву, якая згадваецца ў шэрагу старых дакументаў. У пачатку XVIII стагоддзя протаіерэем у ёй быў Тодар Грыневіч. 17 жніўня 1712 года на яго хату здзейснілі напад мясцовыя шляхцічы Ян і Сымон Плонскія: павыбівалі дзверы і вокны, пабілі яго сына Міхала, а таксама іх парабкаў Яна Дарошку і Міхала Царыка.

Праз год, 20 верасня 1713 года святар Азёрскай царквы Грыгор Куляшэўскі ўнёс у гарадскі суд скаргу на стрыеўскага падстарасту Антона Казіцкага і Верцялішкаўскага протаіерэя Тодара Грынашкевіча і іншых асоб у тым, што яны рабілі неаднаразовыя наезды на яго хату. Але, не знаходзячы яго на месцы, рабавалі царкоўную маёмасць. Як высветлілася пазней, Казіцкі хацеў з царквы ў Азёрах

Уніяцкая царква ў Азёрах.

забраць келіхі і аддаць Верцялішскаму прэсвітару.

Аднаго ж разу напаткалі Куляшэўскага ў хаце, пасля чаго той збег і схаваўся ў царкве. Згаданыя нападнікі «царкоўныя сцены кулямі нашпігавалі, у дзвярах засовы паламалі», уварваліся ў храм са зброяй і напалі на святара. Выратавалі Куляшэўскага ад смерці, а Азёрскую царкву ад рабавання ваколічныя сяляне, якія пачуўшы пальбу, збегліся да царквы і не далі ўчыніць гвалт.

За наступныя чатыры дзесяцігоддзі Азёрская царква шматразова зведвала на сабе несправядлівасць з боку самых багатых мясцовых шляхецкіх родаў, каталікоў па веравызнанні — Плонскіх і Старжынскіх. У 1754 годзе святар Азёрскай царквы Мацей Грыневіч скардзіўся на іх у Гродзенскі суд. Плонскія і Старжынскія пагражалі Грыневічу фізічнай расправай, незаконна завалодалі царкоўнай зямлёй (маёнткам, лесам, сенажаццю) і рыбнай лоўляй у рэках і азёрах, наносячы страты яе гаспадарцы.

У гэтым жа, 1754 годзе, шляхта Гродзенскага павета дала сваім дэпутатам на сойме інструкцыі, у якіх была пазначана патрэба ў аднаўленні 9 праваслаўных цэркваў Гродзенскай эканоміі, сярод якіх, разам з Гродзенскай Уваскрасенскай, Навадворскай, Крынкаўскай, Скідзельскай і Верцялішкаўскай, называлася і Азёрская.

У 70—80-я гады XVIII стагоддзя ў Азёрах, якімі валодаў апошні кароль Рэчы Паспалітай Станіслаў Аўгуст Панятоўскі, замест старой была пабудавана новая Петра-Паўлаўская ўніяцкая царква, у якой сваёй формай вылучаліся вокны ў выглядзе паўколаў. Нягледзячы на рамонты 1843-га і 1853 гадоў, драўляныя канструкцыі царквы паступова прыходзілі ў заняпад. Пасля будаўніцтва ў цэнтры Азёр царквы Святога Духа ў 1866 годзе, у старым храме захоўвалі архіў і бібліятэку. А яе саму, размешчаную побач з вясковымі пахаваннямі, празвалі «Могілкавай».

...На 1830 год у Азёрах пражывала 426 чалавек мужчынскага полу, з іх 7 шляхцічаў, духоўнага стану — 2, 235 мяшчан-яўрэяў, мяшчан-хрысціян і сялян — 181. У 1839 годзе ўніяты былі пераведзеныя ў праваслаўе, і былая ўніяцкая царква ў Азёрах стала праваслаўнай.

Пасля задушэння паўстання 1863—1864 гадоў у Беларусі расійскія ўлады разгарнулі актыўнае будаўніцтва праваслаўных цэркваў. 25 лістапада 1864 года быў зацверджаны праект новай «праваслаўнай мураванай царквы на 450 чалавек са званіцай» у Азёрах. 11 чэрвеня 1867 года будаўніцтва царквы Святога Духа было завершана і яна была асвечана.

У 1912 годзе ў склад Азёрскага прыхода ўваходзілі мястэчка Азёры, вёскі Стрыеўка, Канчатка, Лакно, Лозы, Каневічы, Пыра, Пруды, Губінка, урочышчы Берві, Бярэзіна, Дубінка, Бабіна, Конна, Масткі, Бушнева з насельніцтвам каля чатырох тысяч чалавек.

У 1895 годзе ў Азёрах з'явілася гарбарнае прадпрыемства, а ў 1899-м аднавіла дзейнасць папярова-кардонная фабрыка. Калі ў 1878 годзе ў Азёрах пражывала 1013 чалавек, з якіх 508 яўрэяў, то ў 1897 годзе ўжо 3283 жыхары.

У 1915 годзе, у час Першай сусветнай вайны, Азёры апынуліся пад нямецкай акупацыяй, а пасля заключанага ў 1921 годзе Рыжскага мірнага дагавора — у складзе другой Рэчы Паспалітай. Новая ўлада ўслед за немцамі разгарнула актыўную высечку мясцовых лясоў. Так Азёры і зрабіліся цэнтрам гміны Гарадзенскага павета Беластоцкага ваяводства. На зямлі былога маёнтка Валіцкіх Вільянава пасяліліся «асаднікі» — удзельнікі польска-савецкай вайны, адна з бітваў якой адбылася каля вёскі Новая Руда (10 лютага 1940 года ўсе сем'і асаднікаў былі дэпартаваныя ў глыб СССР).



Адна з Азёрскіх вулачак (1930-я гады).

Паступова пасля вайны аднаўлялася колькасць насельніцтва мястэчка. У 1921 годзе тут жыло 1755 чалавек, а на 1935-ы — ужо 2700 жыхароў, з якіх 550 былі каталікамі, 900 — праваслаўнымі, а 1300 — іўдзеямі. З мястэчка ў Гродна можна было патрапіць па чыгунцы і аўтобусам.

Азёры мелі маляўнічыя вулачкі, забудаваныя драўлянымі хаткамі. Пасярэдзіне Рынку ў акружэнні старых дрэў стаяла мураваная царква, а побач драўляны касцёл з дзвюма вежамі. У 1928 годзе ён быў адноўлены, і, нягледзячы на шэраг перабудоў, захаваў амвон з XVII стагоддзя, а ў рызніцы знаходзіліся прыгожыя арнаменты са слуцкіх паясоў. Бліжэй да возера стаяла старая драўляная сінагога. Па суседстве знаходзіўся пабудаваны пры паляках чыгуначны вакзал, у асноўным для вывазу дрэва з Гродзенскай пушчы. Для перапрацоўкі дрэва, сплаўленага па вадзе, за возерам была пабудавана вялізная лесапільня, побач драўляны порт, поўны плытоў.

У мястэчку знаходзіліся начлежныя дамы Генаха Лацкага пры вуліцы Пілсудскага, 22 і Давіда Бэркавіча пры вуліцы Кароткай, 7. Абодва мелі па тры пакоі, кошт — адзін злоты за ложак. На Рынку знаходзіўся рэстаран У. Гізоўскага. Гандаль адбываўся ў чацвер, а ў пачатку кастрычніка ладзіўся штогадовы кірмаш.

У 1939 годзе Азёры ўвайшлі ў склад БССР і ў 1940 годзе сталі цэнтрам сельсавета. Але ў чэрвені 1941 года мястэчка апынулася пад нямецкай акупацыяй.

На тэрыторыі сённяшняй Чырвонаармейскай вуліцы двухпавярховы дом з вадаправодам заняла «гміна», у якой пражываў нямецкі камісар з сям'ёй. Побач было створана «гета», куды сагналі 1370 яўрэяў. Яно было злучана з гмінай тунэлем памерам 2х2 метры.

Згодна з аповедам мясцовага жыхара В. А. Таянка, схопленых людзей праводзілі праз гэты ход у бункер, дзе іх дапытвалі, катавалі і забівалі. Побач знаходзіліся вальеры з галоднымі ваўкамі і лісамі, да якіх таксама кідалі вінаватых, на думку фашыстаў, людзей. Не пазней за 5 сакавіка 1943 года немцы і паліцаі забілі ўсіх азёрскіх яўрэяў.

Пасля заканчэння вайны бетонны ўваход у тунэль засыпалі. Але яшчэ ў пачатку 1980-х гадоў пры капанні калодзежа глыбока ў зямлі былі знойдзены вялізныя шпалы даўжынёй каля трох метраў.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны ад некалі багатай яўрэйскай культуры не засталося нічога. Сінагога, як і старая «Могілкавая» царква ды касцёл, былі спалены. І калі ў 1994 годзе каталіцкі храм на месцы былога знішчанага быў адноўлены, то аднаўляць страчаную спадчыну яўрэйскага народа ў Азёрах не засталося каму. Нават старыя яўрэйскія могілкі, якія знаходзіліся з правага боку пры дарозе на Астрыну сёння зараслі дрэвамі.

Аднойчы на адну з гадавін Перамогі на парэштках фундамента былога гета мясцовыя жыхары заўважылі мужчыну, які плакаў. На пытанне, што з ім, ён адказаў, што яго тут катавалі, але ён цудам збег праз дымаход і застаўся жывы. У адрозненне ад тых соцень азярчан, хто быў знішчаны фашыстамі.

Васіль ГЕРАСІМЧЫК

■ Знаходка

ПЯЧАТКА ЕФРАСІННІ

Падчас пашукова-археалагічных работ каля паўднёвай сцяны Спаса-Праабражэнскага храма Полацкага Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра была знойдзена пячатка Ефрасінні Полацкай XII стагоддзя.

Гэту знаходку зрабіў Аляксандр Салаўёў, вядучы навуковы супрацоўнік навукова-рэстаўрацыйнага аддзела Полацкага музея-запаведніка. Навуковае кіраўніцтва раскопкамі ажыццяўляюць навукоўцы з Беларусі і Расіі, яны і далі першыя каментарыі.

— Гэта віслая пячатка, такія звычайна да дакументаў таго часу прымацоўвалі, каб іх ніхто не прачытаў. Унутры прапускаўся шпагат, — расказаў Аляксандр Салаўёў. — Яе адшукалі ў знойдзенай гэтым летам грабніцы-араксоліі.

Старшы навуковы супрацоўнік Эрмітажа (Санкт-Пецярбург) Яўген Торшын адзначыў:

— Слой разбурэнняў, які складаўся з рэштак цэглы, друзу, пакрываў увогуле ўвесь раскоп. Сама грабніца з пячаткай ніяк не звязана. У 2015 годзе ў непасрэднай блізкасці ад гэтай пячаткі была знойдзена і іншая — яе адшукалі на ўчастку, дзе праходзіла калісьці сцяна XII стагоддзя. Сцяна была рассечана і знішчана пры дэмантажы галерэй. Верагодна, тады нейкія слаі, што знаходзіліся пад падлогай, папалі ў засыпку.

Кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі і методыкі выкладання гісторыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта Іна Калечыц удакладніла:

— Знойдзеная цяпер пячатка вельмі адрозніваецца ад першай па якасці выканання, па тэхніцы. Вельмі тонкая работа. Гэта пячатка двухбаковая. З аднаго боку мы бачым выяву прападобнай Ефрасінні Александрыйскай — патранэсы, заступніцы Ефрасінні Полацкай. Мы бачым востры куколь у яе на галаве. У адной руцэ яна трымае крыж, другой дабраслаўляе. І надпіс з абодвух бакоў выявы «Іефрасіння». Калі пішацца пра саму прападобную Ефрасінню Полацкую — пішацца «Афрасіння», верагодна, каб адрозніваць. Афрасіння — так хутчэй за ўсё яе называлі. Па крузе ішоў надпіс, які павінны быў чытацца як «Госпадзі, дапамажы рабе тваёй Афрасінні на многія леты». Застаўся толькі невялікі кавалачак «на многія леты». Астатні надпіс і лік былі наўмысна сапсаваны нейкім спецыяльным інструментам. Магчыма, атрымаўся не вельмі добры адбітак пячаткі. З другога боку змяшчаецца выява Хрыста Збавіцеля «Пантакратар», якая амаль цалкам супадае з выявай, што знаходзіцца ў Спаса-Праабражэнскім храме Полацкай абіцелі на фрэсцы. Такім чынам, гэта і пячатка прападобнай, і пячатка манастыра.

«Вельмі тонкая работа»

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ. *nina@zviazda.by*

Пантэон Айчыны

ГАННА СВЯТАСЛАЎНА

(? — 1418)

Вялікі князь літоўскі і рускі Вітаўт, прайшоўшы не адно кола зямнога пекла, загрубеў душою, але прысутнасць побач з ім жонкі Ганны вярнула яму юнацкую высакароднасць, змякчыла ваяўнічую натуру. «Жонка мае на яго вялікі ўплыў, але якая ж гэта жанчына!

Рэдкасць і вялікая рэдкасць паміж Евінымі дочкамі... Ён знайшоў у ёй анёла-ахоўніка», — пісаў пра Ганну крыжацкі чыноўнік Конрад Кібург, які ў 1398 годзе наведаў Вільню і пазнаёміўся з гэтай дзівоснай жанчынай. І ён быў зачараваны яе дабрынёй і прыязнасцю.

Ганна была другой жонкай Вітаўта. Першая, Марыя Лукомская, памерла пры родах дачкі Сафіі ў 1376 годзе. Вітаўт, якога заўсёды хвалявала жаноцкая прыгажосць (за што яго дакаралі, бо часта ён кідаў войска і адпраўляўся да чарговай каханкі), нядоўга насіў жалобу па Марыі. У 1377 годзе ён ажаніўся з юнай прыгажуняй Ганнай, дачкой смаленскага князя Святаслава Іванавіча. Не хочацца шукаць у гэтым шлюбе нейкую палітычную падаплёку, бо пры жаданні Вітаўт, на той час ужо гарадзенскі князь, мог знайсці і лепшую і больш выгадную для яго партыю, але вось выбраў Ганну — гэта быў выбар яго сэрца. І Ганна зрабілася яго вернай спадарожніцай па жыцці, нарадзіла яму сыноў Юрыя ды Івана, а калі мужу пагражала смерць, вырвала з рук Ягайлавых жывадзёраў, паводле слоў Конрада Кібурга.

Як вядома, у 1382 годзе падчас міжусобнай вайны, Кейстут і Вітаўт трапілі ў палон да Ягайлы. Паверыўшы хлуслівым словам апошняга, яны прыехалі ў ягоны стан для перамоў і былі схоплены. Неўзабаве Кейстута задушылі ў Крэўскім замку. Туды кінулі і Вітаўта. Ягайла сустрэўся з ім. Знясілены і хворы, страціўшы надзею на вызваленне, Вітаўт прыніжана прасіў вялікага князя вызваліць яго і абяцаў веру і праўду служыць яму. Ягайла пашкадаваў стрыечнага брата, але ад яго патрабавалі расправіцца з Вітаўтам маці Ульяна Цвярская і брат Скіргайла. Ён вагаўся пад іх упартым націскам. Не караў і не вызваляў. Затое дазволіў Ганне даглядаць хворага мужа. А ворагі Вітаўта даслалі крэўскаму кашталяну ліст з патрабаваннем расправіцца з вязнем, бо Ягайла можа перадумаць і памілаваць яго. Пра падрыхтоўку забойства мужа выпадкова даведалася Ганна, пачуўшы размову вартавых: «Калі князь вялікі Вітаўт будзе сядзець тут далей, дык яго чакае тое самае, што і бацьку». Каханне да мужа, адчай перад яго стратай штурхнулі Ганну да рызыкі і дзеяння. Ганна змовілася з ашмянскімі шляхцічамі, якія выслалі да Крэва невялікі конны атрад. Угаварыла княгіня дапамагчы ёй і сваю прыслужніцу Алену, нявесту вернага Кейстутавага слугі Рыгора Амуліча, які загінуў, абараняючы князя.

У адзін з восеньскіх вечароў Ганна разам з Аленай наведала мужа. Вартавыя ўжо прызвычаіліся да іх і нічога падазронага не заўважылі. У каморы Алена прапанавала Вітаўту ўцячы, пакінуўшы замест сябе яе. Яна ведала, што яе чакае смяротнае пакаранне, і на адмову Вітаўта рашуча заявіла: «І я жадаю паслужыць Радзіме, мне прыемна будзе памерці за Літву. Ты, вызваліўшыся, зробіш дзеля яе столькі дабрага, дазволь і мне ўдзельнічаць у гэтым. Калі любіш Літву, дык паслухай мяне». Высакародная дзяўчына ахвяравала сабой дзеля жыцця Вітаўта. І ён прыняў яе ахвяру. У яе вопратцы, прыкрыўшы твар капюшонам накідкі, Вітаўт разам з жонкай выйшаў з каморы. Вартавыя не разглядзелі яго, прыняўшы за служанку. Кароткім было развітанне, трэба было спяшацца. Вітаўт у цемры па вяроўцы спусціўся са сцен, перабраўся цераз роў і дабраўся да лесу, дзе яго чакалі ашмянскія шляхцічы. Так, дзякуючы Ганне і самаахвярнасці служанкі Алены, Вітаўт вырваўся на волю.

Вітаўт і Ганна.

Услед за мужам з Крэўскага замка выехала Ганна. Яны сустрэліся ў месцы, дзе пазней Вітаўт паставіць на памяць царкву, вядомую цяпер, як знакаміты Маламажэйкаўскі храм-цвержа. Разам яны выправіліся ў цяжкае падарожжа свайго новага жыцця выгнаўцаў. Ганна падзяліла лёс Вітаўта і згадзілася быць за яго закладнікам у крыжакоў.

Доўгае змаганне Вітаўта з Ягайлам зрэшты закончылася іх прымірэннем у 1392 годзе. Ягайла прызнаў Вітаўта вялікім князем. Толькі яго радасць змянілася смерцю сыноў, якіх атруцілі крыжакі. Такую дарагую цану заплаціў ён за велікакняжацкую карону, а пра сваё гора мог забыцца ў дзяржаўных справах і клопатах, будучы, як яго называлі, «бацькам Айчыны». А вось Ганне як было пачуваць сябе з горыччу страты дзяцей, як забыцца?

Яна ўзяла на сябе клопат уладкаваць сямейны дабрабыт свайго вечна занятага дзяржаўнымі справамі мужа. Суправаджала яго ў паездках па краіне. Разам траплялі ў небяспечныя становішчы. У 1398 годзе яны ледзь не згарэлі ў пажары, які ўначы ўспыхнуў у Гарадзенскім замку. Разбудзіла іх, фактычна выратаваўшы, ручная малпа. У 1409 годзе яны разам хаваліся ад крыжакоў, якія напалі на Ваўкавыск, жадаючы перахапіць іх па дарозе ў Бярэсце. Так што жыццё з вялікім князем было для Ганны не толькі неспакойным, але і небяспечным. Ды яна не наракала на лёс, пераносіла цяжкасці і выпрабаванні, што выпадалі яе мужу. Але яе пяшчотнае сэрца, што так блізка прымала ўсе трывогі мужа, не вытрымала. У 1418 годзе Ганна памерла.

З імем княгіні звязваюць будаўніцтва знакамітага касцёла Святой Ганны ў Вільні. Нібыта гэта яна пабудавала ў 1396 годзе гэткі маленькі шэдэўр вялікага дойлідства. Навейшыя даследаванні прыпісваюць будаўніцтва храма дойліду Ягелонаў Бенедыкту Рэйту, які ўзвёў яго ў 1495—1500 гадах. Аднак не выключана, што новы храм паўстаў на месцы былога, узведзенага Вітаўтам у гонар любімай жонкі. І хоць ён ажаніўся трэці раз, але кахаў Ганну і прасіў пахаваць яго «побач з пагробкам памерлай жонкі, дзе і для сябе дамавіну выбраў», каб быць разам з ёй назаўжды.

Вітаўт ЧАРОПКА.

■ Сваімі словамі

«САЛОДКІ» СКАРЫНА

Ці патрэбна мяжа ўсенароднай любові да першадрукара?

Адна з самых значных дат мінулага паўтысячагоддзя надышла. Скарына выдаў першую друкаваную кнігу 6 жніўня. А мы годна ўспомнілі пра гэта праз 500 гадоў (і шмат урачыстасцяў яшчэ пройдзе ў найбліжэйшы час). Асаблі-ва апантаныя працай першадрукара людзі паставіліся да адзначэння важнай падзеі досыць крэатыўна — чым выклікалі хвалю абурэння і крытыкі ад нязгодных з такімі падыходамі. А што думаеце вы?

Па электронным сеціве актыўна гуляюць партрэты Скарыны, дзе першадрукар намаляваны то ў акулярах, то з мабільным тэлефонам у руках — а то і з павелічальным шклом, праз якое глядзіць на свет. Не ўсім прыйшліся даспадобы такія «жарцікі». Маўляў, як пасмелі гуляцца з вобразам тытана беларускага Адраджэння?! Як адважыліся ўносіць змены ў амаль што кананічны партрэт?..

Аднак мне прыгадваецца, што акурат сам Скарына ў свой час быў наватарам. І калі ён размясціў уласны партрэт у Святым Пісанні, тое таксама выклікала хвалю абурэння.

Многія мяркуюць, што, калі б Скарына жыў у наш час, то безумоўна, карыстаўся б сацыяльнымі сеткамі — ствараў бы сабе старонкі на папулярных інтэрнэт-рэсурсах. Таму ідэя зарэгістраваць акаўнт Скарыны ў сеціве цяпер, у XXI стагоддзі, проста лунала ў паветры. І знайшліся тыя, хто такі зарэгістраваў першадрукара ў інстаграме (самая папулярная маладзёжная праграма). На працягу пэўнага часу там выкладваліся малюнкі, якія ілюстравалі пэўныя гістарычныя перыяды жыцця Скарыны. Напрыклад, стваральнікі старонкі славутага палачаніна паспрабавалі ўявіць, як бы мог выглядаць яго выпускны ў 1506 годзе ў Кракаве. Побач з малюнкам, дзе сімпатычны маладзён (пэўна ж, Скарына) са стужкай выпускніка трымае разам з некалькімі сябрамі куфлі піва, змяшчаюцца дасціпныя допісы. Карыстальнік «Франак-друкар» паведамляе, што гэта «паці ў Вавелі», не забываючы паставіць пазнаку «#малады спецыяліст». Нехта «Казік» тут жа пытаецца, хто сыходзіў апошні і ці не бачылі яго дыплом? Ну а «Лука_Скарына» (пэўна ж, маецца на ўвазе бацька першадрукара) піша наступнае: «Яшчэ хоць раз — ніякіх перадачак з Полацка». Дарэчы, пагартаўшы гэты інстаграм, у такой вось вясёлай форме, можна дакладна запомніць, у якіх гарадах бываў наш першадрукар і што там з ім адбывалася.

Не дарэмна жартуюць, што, калі ў наш час цябе няма ў сеціве, то, лічы, цябе няма зусім. Вядома ж, не стаўцеся да гэтага выказвання зусім сур'ёзна. Аднак частка рэальнага жыцця сапраўды перакачавала ў віртуальнае. Там адбываюцца многія дыскусіі і абмеркаванні, там прызначаюцца сустрэчы і рассылаюцца запрашэнні. Там жа можна адсвяткаваць пэўную падзею — нават ніяк не згадаўшы яе ў жыцці рэальным. Да юбілею кнігадрукавання музыка Аляксей Фралоў заклікаў усіх акурат 6 жніўня выкладваць свае фотаздымкі, зробленыя каля помніка Скарыну (калі такія маюцца) і пісаць пра святочную падзею — каб дакладна ніхто не прапусціў урачыстасць. Некаторыя «жыхары сеціва» вырашылі далучыцца да свята, замяніўшы свае профільныя выявы партрэтамі першадрукара. Запрацаваў нават адмысловы сайт 500god.by, створаны спецыяльна для ўсеагульнага святкавання знакавага юбілею.

Што казаць, і «Звязда» не засталася ў баку. На нашым фірмовым календары, зробленым на ўвесь 2017 год, таксама змешчаны партрэт Скарыны.

Многія ўстановы пастараліся выпусціць адпаведную сувенірную прадукцыю (але хацелася б бачыць яшчэ больш розных «Скарын»). Так, на Белпошце выйшла адмысловая паштовая марка з выявай першадрукара і канверт «Першы дзень» — усё гэта разам можна набыць і ў прыгожай залатой рамцы як адмысловы сувенір. На Добрушскім фарфоравым заводзе выраблены кубачак, на якім змешчаны партрэт Скарыны, — той самы, што і ў Псалтыры. Брэнд адзення LSTR вырабіў прыгожыя майкі, з вялікімі прынтамі «Сонца Маладзіковае» — надзяваеш такую, і адразу адчуваеш сябе нібы датычным да вялікай справы першадрукара.

6 жніўня адмысловыя набажэнствы, са згадкамі пра тое, што зрабіў наш зямляк 500 гадоў таму, праходзілі ў некаторых цэрквах і касцёлах. У гэты дзень вандроўнікі з розных куткоў скіроўваліся не толькі ў старажытны Полацк. Адразу дзве групы з Мінску арганізавалі паездкі ў Прагу — адна пад кіраўніцтвам філосафа і тэолага Ірыны Дубянецкай, другая — з гісторыкам і экскурсаводам Паўлам Каралёвым. Спявачка Кацярына Ваданосава, апынуўшыся ў Італіі, не змагла не наведаць у святочны дзень Падую. Тое ж можна сказаць і пра іншыя мясціны, дзе бываў першадрукар, — безумоўна, яны не засталіся без гасцей, што прыехалі туды дзеля памяці пра нашага асветніка.

Адным з самых экстравагантных спосабаў ушанавання аказаўся... торт, спечаны ў выглядзе Бібліі Скарыны. Важыць такі салодкі памятны ласунак ажно 25 кілаграм! Спечаны ён у Віцебску мясцовай жыхаркай Настассяй Зямлянкай. У нядзелю, пасля набажэнства, яго разам елі вернікі адной пратэстанцкай царквы. Здымкі торта, размешчаныя ў сеціве, некаторыя карыстальнікі ацанілі досыць крытычна: маўляў, гэта блюзнерства, рабіць з Бібліі торт! Нехта ўбачыў у гэтым і клаўнаду, і непрыстойнасць адначасова.

У часы, калі жыў Скарына, яго таксама не разумелі. Чаму менавіта кнігавыданне? З якой прычыны абрана Біблія? Навошта змяшчаць каментарыі, дзеля чаго ўжываецца старабеларуская лексіка? Не ўпэўнена, што сам першадрукар мог сфармуляваць дакладныя разгорнутыя адказы на гэтыя пытанні — хутчэй інтуітыўна адчуваў, што мусіць рабіць так, а не іначай.

Відавочна, што ідэальным для грамадскага меркавання з'яўляецца толькі той, хто нічога не робіць. Таму нам трэба навучыцца рухацца наперад, не баючыся памылак. Нехта не зразумее, нехта пакрытыкуе ці ўвогуле будзе імкнуцца ануляваць тваю працу. Аднак менавіта дзівакі ствараюць гісторыю. Жыццё — не заўсёды паслухмяная котка. Часам трэба адважыцца пагладзіць яе супраць поўсці. Кожны мае права на ўласнае бачанне. І можа вырашаць сам, як яму аддаваць даніну памяці Скарыну.

Падаецца, менавіта так мусім мы ўзгадваць пра вялікіх дзеячаў нашай гісторыі: усенародна, з нечаканымі падыходамі. Хтосьці радуецца і прыдумвае пэўныя цікавінкі — іншы ў той жа момант абражаецца. Праўда ў кожнага свая. І толькі ў Бібліі ісціна адна.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ. *nina@zviazda.by*

Извещение о проведении аукционных торгов с условиями на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) в г. Бресте

Предмет аукциона	Право на заключение договора на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий и сооружений) лот №1 по ул. Лейтенанта Рябцева, 12 на земельном участке площадью 1,3030 га
Функциональное назначение земельного участка	право проектирования и строительства объекта административно-торгового назначения (за исключением продовольственной группы товаров)
Вещное право предоставляемого земельного участка	**в аренду сроком на 5 лет**
Объекты недвижимости, подлежащие сносу	объекты недвижимости КУП «ЖРЭУ г. Бреста», ООО «Анигос», ПРУП «Брестоблгаз»
Снос объектов недвижимости производится в установленном законодательством порядке. Объекты расположены в районах с развитой инженерной инфраструктурой	
Начальная цена продажи (руб.)	**190 094,34**
Сумма задатка (руб.)	38 000,00
Расходы по подготовке градопаспорта, земельно-кадастровой документации, тех. условий, АПЗ (руб.)	**8 482,80**
Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельных участков и сносом расположенных на них объектов недвижимости, возмещаемый победителем аукциона землепользователям (руб.)	**90 416,07** *(на 23.05.2017 г.)*

Организатор торгов – КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью»

Условия продажи

Земельный участок будет предоставляться победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, выразившему согласие на предоставление ему предмета аукциона в аренду сроком на 5 лет для строительства и обслуживания объекта, на основании решения Брестского горисполкома об изъятии и предоставлении земельного участка, при соблюдении следующих условий:

- в день проведения аукциона будет подписан акт выбора места размещения земельного участка;
- в установленном порядке будет заключен с проектной организацией договор на разработку проектной документации на строительство объекта (с выделением при необходимости отдельных этапов) с учетом ее государственной экспертизы в срок, не превышающий два года, со дня утверждения акта выбора места размещения земельного участка;
- при проектировании и строительстве объекта будет учтен регламент использования и застройки земельного участка, установленный градостроительным паспортом;
- в срок, не превышающий одного года со дня утверждения акта выбора места размещения земельного участка, будет предоставлен в ДУП «Проектный институт Брестгипрозем» генеральный план объекта строительства с проектируемыми инженерными сетями, разработанный в составе проектной документации – архитектурного проекта или утверждаемой части строительного проекта, с учетом прохождения в установленном порядке согласования в управлении архитектуры и градостроительства Брестского горисполкома, и заключен договор подряда на разработку проекта отвода земельного участка под объект строительства;
- в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона на р/с городского бюджета будут внесены суммы платежей, отраженных в протоколе о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся в размерах, определенных соответствующим протоколом аукционных торгов в счет оплаты за предмет аукциона (часть платы – в случае представления рассрочки ее внесения в установленном порядке) победителем аукциона – в размере цены продажи, сформированной по результатам аукциона, а единственным участником – в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов, и компенсации расходов, понесенных городским бюджетом, по подготовке земельно-кадастровой документации, архитектурно-планировочного задания и технических условий на размещение объекта, а также возмещения организатору аукциона суммы затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которой определяется до аукциона и фиксируется в соответствующей ведомости ознакомления участников);
- до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка, подписания договора на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений), а также договора аренды земельного участка будут выполнены условия, предусмотренные в решении об изъятии и предоставлении земельного участка.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:

- заключить договор на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений после совершения оплаты соответствующих сумм, но не позднее двух рабочих дней;
- в течение шести месяцев со дня государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него приступить к занятию участка в соответствии с указанной целью и условиями его предоставления

Аукцион проводится в соответствии Положением о порядке организации и проведения аукциона с условиями на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений), утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462, и состоится при наличии не менее двух участников. В аукционе могут участвовать юридические лица и индивидуальные предприниматели.

Перечень документов, представляемый участником аукциона: заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); **юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем –** копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; **иностранным юридическим лицом –** копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык**; представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) –** доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Порядок осмотра предмета аукциона (лота) осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права, обязанности и ответственность сторон в процессе подготовки и проведения аукциона

Задаток в размере до 20% от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с №BY73AKBB30127803600111000000 в филиале №100 Брестское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Бреста, код банка AKBBBY21100, УНП 290433924

Аукцион состоится 14 сентября 2017 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, актовый зал
Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 15.08.2017 г. до 17.30 08.09.2017 г. (перерыв с 13.00 до 14.00; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50.
Контактные телефоны: 53 81 92, 53 45 65.
Сайты: www.bgcn.by, www.city.brest.by и www gki.gov.by

20 сентября 2017 г. ИЗВЕЩЕНИЕ №12-А/2017 о проведении открытого аукциона на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Гомеле

№ лота	Адрес земельного участка: г. Гомель	Кадастровый номер участка	Площадь, га	Целевое назначение	Наличие ограничений	Срок аренды (лет)	Начальная стоимость, руб.	Сумма задатка, руб.	Расходы на подготовку документации, руб.
1	ул. Кленковская в районе домов №14 – №30 (со стороны "Восточного обхода")	340100000002005663	1,1800	для строительства и обслуживания таунхаусов (группы блокированных жилых домов)	охранная зона линий электропередачи, водоохранная зона водных объектов. Проведение комплекса противопаводковых мероприятий (защита территории от 1% затопления паводковыми водами)	55	124 830 р. 40 коп.	6 500 р. 00 коп.	3 288 р. 66 коп.
2	по проспекту Октября	340100000006005474	0,0032	для установки часозвони	оганичений в использовании не имеет	5	395 р. 42 коп.	20 р. 00 коп.	2 285 р. 86 коп.
3	в районе улиц Фадеева – Евремова	340100000003003245	0,2793	для строительства и обслуживания объекта общественного питания с системой по типу МакДрайв	охранная зона сетей и сооружений канализации	5	41 368 р. 04 коп.	2 100 р. 00 коп.	2 488 р. 07 коп.
4	в микрорайоне №19 (позиция №65 по генплану)	340100000001006221	0,4309	для строительства и обслуживания банно-оздоровительного комплекса	охранная зона линий электропередачи, водоохранная зона рек и водоемов	5	76 938 р. 08 коп.	4 000 р. 00 коп.	3 394 р. 26 коп.
5	в районе усадебной застройки «Романовичи" (позиция №3 по генплану, первая очередь строительства)	340100000008003689	0,7277	для строительства и обслуживания здания специализированного розничной торговли (универсам)	ограничений в использовании нет	10	36 748 р. 28 коп.	2 000 р. 00 коп.	320 р. 78 коп.

1. Организатор аукциона – Коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «Гомельгеодезцентр» (далее – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр»).

2. Аукцион проводится комиссией, созданной Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр», в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. №462. Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории осуществляется согласно техническим условиям, выданным эксплуатирующими и согласующими организациями на стадии производства проектно-изыскательских работ. Желающим предварительно ознакомиться с документами и характеристикой расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий необходимо обращаться в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» (г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. №3-6).

3. **Аукцион состоится 20 сентября 2017 г. в 15.00 в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, каб. 115,** при наличии не менее двух участников на каждый лот. Если заявление на участие подано только одним гражданином, юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем право аренды земельного участка предоставляестя этому лицу при его согласии с внесением платы за право аренды в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.

4. К участию в аукционе допускаются граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, подавшие в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр», в указанные в извещении сроки, следующие документы: заявление по установленной форме; документ, подтверждающий внесение суммы задатка за каждый лот в размере, указанном в извещении с отметкой банка, на **р/с BY74 BAPB 3012 2030 8001 3000 0000 в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, УНП 400230163, БИК BAPBBY23912. Получатель платежа – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр». Наименование платежа – оплата задатка за участие в аукционе.** Кроме того, **НЕОБХОДИМО открыть текущий расчетный счет (с указанием транзитного счета) в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30 – для возврата задатка за участие в аукционе** (в случае непобеды на аукционных торгах).

Необходимые документы:

4.1 граждане – копию документа, содержащего их идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

4.2 представители или уполномоченные должностные лица юридических лиц Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

4.3 идивидуальные предприниматели – копию свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования;

4.4 представители гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность;

4.5 представители или уполномоченные должностные лица иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

4.6 представители иностранного гражданина – легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или другой кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

4.7 при подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность и его копию.

5. **Кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации, победитель обязан возместить организатору торгов затраты на подготовку и проведение аукциона.** Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

6. Гомельским городским исполнительным комитетом в установленном законодательством порядке может быть предоставлена рассрочка внесения оплаты стоимости предмета аукциона в соответствии с решением Гомельского городского исполнительного комитета от 04.02.2009 г. №83 «Об утверждении Инструкции о порядке предоставления рассрочки по внесению платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».

7. **Заявления для участия в аукционных торгах принимаются Государсвенным предприятием «Гомельгеодезцентр» с 15 августа по 18 сентября 2017 г. включительно. Дни приема: понедельник, среда, пятница с 08.00 до 16.30 (обед 12.00-13.00) по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. 3-6**

Заключительная регистрация зарегистрированных участников аукциона с 14.30 в день проведения аукциона по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, каб. №115.

Контактные телефоны: 41-97-86 Информация размещена на сайте: www.gomel.gov.by либо geodezcentr.by

Извещение о проведении аукционных торгов по продаже земельных участков в г. Бресте в частную собственность граждан и негосударственных юридических лиц Республики Беларусь

№ лота	Адрес участка	Кадастровый номер 14010000000	Общая площадь (га)	Целевое назначение использования участка	Начальная цена предмета аукциона (руб.)	Сумма задатка (руб.)	Расходы по подготовке зем.-кадастр. док. (руб.)	Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке, в т. ч. ограничения и условия в его использовании
1	пер. 6-й Лыщицкий, 5	1030095	0,1107	для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	**14 608,96**	2 920,00	1 721,74	0,0033 га – охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт; 0,0057 га – охранная зона газопровода среднего давления
2	в районе бывших населенных пунктов Плоска-Мощенка (участок №4)	1023097	0,1104		**14 909,22**	2 980,00	**1 650,85**	0,0033 га – охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт; 0,0213 га – охранная зона электрических сетей напряжением свыше 1000 вольт; 0,0075 га – охранная зона сетей и сооружений водоснабжения; 0,0084 га – охранная зона сетей и сооружений канализации

Размер штрафа, уплачиваемый в случаях, определенных с Положением о порядке проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. №462 **2 300,00 рублей**

Организатор аукционных торгов – КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» | **Задаток в размере до 20% от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с №BY73AKBB30127803600111000000 в филиале №100 Брестское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Бреста, код банка AKBBBY21100, УНП 290433924**

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462 и состоится при наличии не менее двух участников. В аукционе могут участвовать граждане Республики Беларусь.

Перечень документов, представляемый участником аукциона: заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); **гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина** – нотариально удостоверенная доверенность; **представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица** – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Лицо, желающее принять участие в аукционе, **обязано** подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Порядок осмотра объекта осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%, обязан:

• в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов:

- осуществить оплату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке). Оплата цены продажи предмета аукциона может быть осуществлена в рассрочку, в соответствии с решением Брестского городского исполнительного комитета от 24.10.2016 г. №1687;
- возместить расходы, понесенные городским бюджетом по подготовке земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка;
- компенсировать организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников).

• в течение 2-х месяцев со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обратиться за государственной регистрацией права частной собственности на участок;

• получить утвержденную в установленном порядке проектную документацию на строительство капитального строения (здания, сооружения) в срок не превышающий 6 (шести) месяцев;

• приступить к занятию земельного участка (начать строительство) в течение одного года (для граждан) со дня государственной регистрации возникновения права на него;

• снять с занимаемого земельного участка плодородный слой почвы из-под пятна застройки и использовать согласно проектной документации;

• завершить строительство объекта в сроки, определенные проектной документацией

Аукцион состоится 14 сентября 2017 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, актовый зал
Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 15.08.2017 г. до 17.30 08.09.2017 г. (перерыв с 13.00 до 14.00; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50. Контактные телефоны: 53 81 92, 53 45 65. Сайты: www.bgcn.by, www.city.brest.by и www gki.gov.by



■ Космас

ЦІ ЁСЦЬ БРАТЫ ПА РОЗУМЕ?

Навукоўцы назвалі рэальныя прычыны, чаму людзі да гэтага часу не знайшлі іншапланецян, і які незайздросны лёс можа напаткаць і іх саміх

Уадным толькі Млечным Шляху, паводле розных ацэнак, можа ўтрымлівацца ад 100 да 400 мільярдаў зорак. Патэнцыйна каля кожнай з іх могуць знаходзіцца планеты. Толькі ў назіраным намі Сусвеце можа быць як мінімум два трыльёны галактык, у кожнай з якіх утрымліваюцца трыльёны планет, якія круцяцца вакол сотняў мільярдаў зорак. І нават калі сярод такой колькасці планет тых, што будуць здольныя падтрымліваць жыццё, вельмі і вельмі мала, дзесьці ў Сусвеце ўсё роўна павінна быць разумнае жыццё, акрамя нашага.

Падлікі кажуць, што калі толькі 0,1% планет нашай галактыкі будуць патэнцыйна прыдатныя да жыцця, то гаворка ўжо пойдзе пра колькасць каля аднаго мільёна планет, на якіх можа існаваць жыццё. Такія разлікі заахвоцілі нобелеўскага лаўрэата Энрыка Фермі задацца пытаннем: «Гэй, дык дзе ж вы ўсе?» Гэтае пытанне з'яўляецца перадумовай да так званага парадоксу Фермі, і, на думку сучасных навукоўцаў, найбольш верагодныя адказы на яго будуць звязаныя з самім чалавекам.

Ёсць такая гіпотэза — «Вялікі фільтр». Згодна з ёй, да таго моманту, як разумнае жыццё зможа пакінуць межы свайго роднага свету, яму неабходна пераадолець нейкую сцяну. Той самы Вялікі фільтр. Гіпотэза абвяшчае, што ў глабальным эвалюцыйным працэсе маюцца нейкія пераходныя моманты, якія прыйдзецца пераадолець любой разумнай цывілізацыі, каб атрымаць магчымасць зносін з іншымі светамі. Для некаторых цывілізацый гэтыя пераходныя моманты могуць праходзіць на раннім этапе жыцця, а ў нашым выпадку мы толькі рухаемся да гэтага моманту эвалюцыі. З гэтага заключэння можна зрабіць контрінтуітыўную выснову аб тым, што чым лягчэйшая была наша эвалюцыя да цяперашняга часу, тым горшыя шанцы чалавецтва ў будучыні.

Узяць хоць бы кліматычныя змены. Незалежна ад таго, ці верыце вы ў іх ці не, калі яны будуць пушчаныя на самацёк, то ў канчатковым выніку загубяць большую частку вядомага нам жыцця на Зямлі. Апошнія 12 000 гадоў ці каля таго клімат на планеце быў дзіўна стабільны, што дазволіла чалавечай цывілізацыі заквітнець, перайшоўшы ад сельскай гаспадаркі да індустрыялізацыі, якая па іроніі лёсу можа ўсіх нас і загубіць.

У рамках нядаўніх даследаванняў было ўстаноўлена, якія характэрныя рысы і асаблівасці жывых відаў найбольш верагодна дазволяць ім выжыць ва ўмовах планеты, што перанесла глабальныя кліматычныя змены. Дзвюма найбольш важнымі асаблівасцямі з'яўляюцца невыбіральнасць і здольнасць да хуткага рэпрадуктыўнага цыкла. Зыходзячы з гэтага, можна зрабіць выснову, што людзі не будуць займаць месца сярод першарадных відаў, якія выжывуць у будучыні. З гэтага таксама можна зрабіць і іншую выснову: нягледзячы на тое, што падзеі на іншых планетах (тыя самыя пераходныя перыяды) могуць развівацца па-іншаму, існуе вялікая верагоднасць таго, што на шляху жыцця, якое існавала на гэтых планетах, аказалася столькі перашкод, што цывілізацыі ў канчатковым выніку не змаглі іх пераадолець.

«У Сусвеце, якому некалькі мільярдаў гадоў, дзе зорныя сістэмы падзеленыя не толькі прасторай, але і часам, цывілізацыі могуць з'яўляцца, развівацца і ў выніку самаўхіляцца настолькі хутка, што проста не паспяваюць знайсці сабе падобных. Мы самі жывём у стагоддзе новага масавага вымірання, якое толькі-толькі пачалося. Нас чакае яшчэ вельмі шмат смерцяў», — піша калумніст New York Magazine Дэвід Уолес-Уэлс.

У многіх іншых мысліцеляў маюцца свае адказы на парадокс Фермі. У нейкіх выпадках яны больш дэпрэсіўныя, чым гэты, у нейкіх менш. Прывядзём некалькі прыкладаў. Андэрс Сандберг, оксфардскі астрафізік, член Астранамічнай абсерваторыі Бялграда Мілан Цыркавіч, а таксама Сцюарт Армстронг, эксперт па пытаннях штучнага інтэлекту, лічаць, што іншапланецяне не вымерлі, а проста знаходзяцца ў спячцы, чакаючы астуджэння агульнага касмічнага фону Сусвету.

ПРАФЕСАР Зара Асманава са Свабоднага ўніверсітэта Тбілісі мяркуе, што нашы пошукі іншапланетных мегаструктур рана ці позна яшчэ ўвянчаюцца некаторымі поспехамі, толькі вось шукаем мы іх зусім не каля тых зорак, што трэба. А шукаць трэба, на думку Асманавай, побач з пульсарамі. Фізік Браян Кокс прапаноўвае свой варыянт, у якім для іншых пазаземных цывілізацый справы маглі скончыцца сумна, таму не выключана верагоднасць, што яны могуць скончыцца гэтак жа і для нас. «Чаму б не выказаць здагадку, што рост навукі і інжынерыі мог перасягнуць палітычныя і сацыяльныя нормы і асновы, і ўсё настолькі выйшла з-пад кантролю, што прывяло да катастрофы», — кажа Кокс. «Калі разумнае жыццё на іншай планеце, само таго не жадаючы, сябе ж і знішчыла пад націскам развіцця сваіх тэхналогій, то чаму, уласна, варта выключаць магчымасць аналагічнага лёсу для чалавецтва?»

■

Даследаванне старажытнага закінутага горада Тэатыўакан у Мексіцы дазволіла здзейсніць адкрыццё: пад Пірамідай Месяца археолагі выявілі тунэль.

Тэатыўакан размешчаны за 40 км на паўночны ўсход ад Мехіка. Гэта адзін з найбольш значных помнікаў дакалумбавай Амерыкі. Дакладны ўзрост горада не вядомы, мяркуецца, ён быў закладзены ў 100 годзе да н.э., а большасць яго манументаў будавалася да 250 года н.э. У эпоху свайго найвышэйшага росквіту (250—600 гады н. э.) Тэатыўакан аказваў значны культурны ўплыў на многія вобласці Месаамерыкі. Са сваімі 15 пірамідамі і вялізнай гандлёвай плошчай Тэатыўакан быў большы за любы населены пункт Еўропы.

Да сярэдзіны VII стагоддзя горад быў ужо закінуты. Ацтэкі, якія прыйшлі сюды пазней, заспелі толькі велічныя руіны. Яны і далі ім назву: у прыватнасці, найбуйнейшая гарадская пабудова атрымала імя Піраміды Сонца, а другая па велічыні — Піраміды Месяца. Гэты будынак знаходзіцца каля паўночнага канца Дарогі Мёртвых, завяршаючы двухбаковую сіметрыю храмавага комплексу.

Археалагічныя даследаванні Піраміды Месяца вядуцца з 1998 года. Пад пірамідай былі знойдзеныя пахаванні, якія змяшчаюць астанкі людзей і жывёл, а таксама мноства рытуальных прадметаў. Новае адкрыццё здзейснілі навукоўцы з Нацыянальнага інстытута антрапалогіі і гісторыі Мексікі. Вывучаючы цэнтральную плошчу Тэатыўакана з дапамогай метаду электратамаграфіі, яны знайшлі тунэль, які пракладзены на глыбіні 10 метраў і вядзе да Піраміды Месяца. За апошнія гады археолагі, якія працуюць у Мексіцы, знайшлі некалькі падобных тунэляў — у тым ліку ў Тэатыўакане, пад храмам птушынага змея. Падземны будынак пад пірамідай Месяца будаваўся па тых жа тэхналогіях, але з ім не звязаны.

Грунтуючыся на гіпотэзе аб тым, што Піраміду Месяца выкарыстоўвалі для прынясення ахвяр, спецыялісты мяркуюць, што тунэль сімвалізуе замагільны свет. На наступным этапе даследаванняў археолагі паспрабуюць прабрацца ўнутр, каб знайсці там артэфакты, якія могуць больш расказаць пра гісторыю горада і яго манументаў.

ЗНАЙСЦІ І ВЫРАТАВАЦЬ

Цікавыя факты пра сабак-ратавальнікаў

Чалавецтва ўжо вельмі даўно карыстаецца бясспрэчнай перавагай сабакі — унікальным найтанчэйшым нюхам, а ў нашы дні спецыяльная падрыхтоўка дазваляе сябрам чалавека прымаць самы актыўны ўдзел у найскладанейшых пошукава-ратавальных аперацыях. Штогод у розных кутках зямнога шара службовыя сабакі здзяйсняюць подзвігі, дапамагаючы захаваць тысячы чалавечых жыццяў. Касматыя героі нездарма выклікаюць вялікую павагу і захапленне ў людзей ва ўсім свеце, яны цалкам заслужылі нашу ўвагу. Сёння прапануем вам цікавыя факты з жыцця сабак-ратавальнікаў.

Сабакі «працуюць» пошукавікамі-ратавальнікамі ўжо больш як трыста гадоў. Першымі іх дапамогу сталі выкарыстоўваць манахі з высакагорных прытулкаў у швейцарскіх Альпах. Вялікія вынослівыя сенбернары былі навучаны шукаць падарожнікаў, якія спрабавалі пераадолець горныя перавалы паміж Швейцарыяй і Італіяй, але збіліся з дарогі ці заблудзілі ў зімовую непагадзь.

Вядома, што сабака-ратавальнік вызначае месцазнаходжанне чалавека па паху. Асаблівасці і характарыстыкі гэтага ўнікальнага працэсу дагэтуль да канца не вывучаныя, і менавіта таму чалавецтву яшчэ не ўдалося стварыць прыбор, здольны замяніць чацвераногага сябра. Відаць, сабака здольны «аналізаваць» такія віды пахкіх субстанцый, як эпідэрміс скуры, потааддзяленне, паветра, якое выдыхаюць лёгкія, а таксама прадукты раскладання чалавечых тканак і скуры.

Паводле ацэнак экспертаў, адзін сабака з пошукава-ратавальнай службы можа выканаць працу дваццаці, а то і трыццаці прафесіяналаў-пошукавікаў. Асабліва адораныя сабакі валодаюць нюхам, які перавышае чалавечы ў сто мільёнаў разоў.

У сярэднім за адзін дзень сабака пошукава-ратавальнай службы ў суправаджэнні ратавальніка-кінолага можа абследаваць плошчу прыблізна роўную аднаму квадратнаму кіламетру.

Імавернасць выяўлення крыніцы паху на вялікай адлегласці значна вышэйшая ў пахмурныя дні і начны час. У бязветраны сонечны дзень сабаку значна складаней успрымаць пахі, калі ў выніку канвекцыі ніжнія атмасферныя пласты, награваючыся, паднімаюцца ўверх, а верхнія, становячыся цяжэйшымі, наадварот, апускаюцца ўніз.

На практыцы сабаку-ратавальніка можна, як правіла, аднесці да адной з дзвюх рабочых спецыяльнасцяў. Вышуковым сабакам для эфектыўнага пошуку неабходны адпраўны пункт і прадмет з пахам чалавека, якога трэба знайсці. Такія сабакі карыстаюцца ніжнім нюхам, гэта значыць непасрэдна абнюхваюць зямлю або брук, бяруць след і рушаць па ім да пазначанай мэты. Пошукава-ратавальныя сабакі, наадварот, шукаюць чалавека не па пакінутым следзе, а старанна абнюхваючы навакольную прастору. Пры спрыяльных умовах надвор'я такі сабака здольны выявіць крыніцу паху на адлегласці больш за чатырыста метраў. Рэкорд быў пастаўлены ў тундры на Алясцы, калі пошукава-ратавальнаму сабаку ўдалося адчуць пах на адлегласці ў тры кіламетры. У залежнасці ад выбранай першапачаткова спецыяльнасці вышуковым і пошукава-ратавальным сабакам патрэбна розная праграма навучання.

Службовы сабака можа трапіць у пошукава-ратавальную службу як з прытулку, так і з гадавальніка. Галоўная ўмова — такі сабака павінен быць цвёрда нацэлены на выяўленне «здабычы», гэта значыць прадэманстраваць ладную матывацыю і рашучасць пры пошуку схаванай цацкі.

У большасці выпадкаў для пошукава-ратавальных аперацый выкарыстоўваюцца паляўнічыя і пастуховыя пароды сабак, такія як лабрадор-рэтрывер, залацісты рэтрывер, нямецкая аўчарка, бельгійская аўчарка малінуа, а таксама бордарколі. А вось велічных і адважных сенбернараў часцей за ўсё рыхтуюць для пошуку людзей, засыпаных снежнай лавінай у гарах. Найлепшыя з такіх сабак могуць адчуваць чалавечы пах, калі глыбіня снежнага покрыва перавышае чатыры метры. Ньюфаўндленды не так часта, як іншыя пароды, становяцца сабакамі-ратавальнікамі, аднак, дзякуючы свайму мускулістаму целаскладу, густому ваўнянаму покрыву і падшэрстку, перапончатым лапам, неперавыдзеным плавальным здольнасцям і любові да водных працэдур, гэтым сабакам складана знайсці роўнага пры выратаванні чалавека, які тоне.

Адораныя шчанюкі, адабраныя для навучання па праграме пошукава-выратавальных службаў, як правіла, прыступаюць да заняткаў ва ўзросце васьмі-дзесяці тыдняў ад нараджэння. У сярэднім на аднаго сабаку ідзе каля тысячы гадзін падрыхтоўкі. Калі ў выніку навучання сабака ўсё ж аказваецца непрыдатным для гэтай сапраўды складанай і адказнай дзейнасці, пасля «прафарыентацыі» ён можа атрымаць больш адпаведную для яго характару спецыяльнасць, напрыклад авалодаць пошукам выбухоўкі ці наркотыкаў, стаць падмогай людзям, якія маюць патрэбу ў суправаджэнні або пакутуюць ад посттраўматычнага засмучэння. У рэшце рэшт, такі сабака можа проста апынуцца ўлюбёнцам сям'і.

Праца ў якасці ратавальніка патрабуе ад чатырохногага сябра вялікай канцэнтрацыі ўвагі, таму такія сабакі, як правіла, выходзяць на пенсію або пераходзяць на менш адказныя «пасады» ва ўзросце васьмі-дзесяці гадоў.

Сабак, навучаных шукаць рэшткі загінулых ахвяр, на прафесійным жаргоне называюць «трупнымі» сабакамі. Ім пад сілу знаходзіць цэлыя целы і іх часткі, у тым ліку тыя, якія знаходзяцца пад вадой і закапаныя ў зямлю, а таксама фрагменты: валасы, тканкі, кроплі крыві, асобныя часткі шкілета і косці.

Сабакі пошукава-выратавальнай службы часта суправаджаюць сваіх гаспадароў-кінолагаў нават на адпачынку, каб у любую хвіліну быць гатовымі да магчымай надзвычайнай сітуацыі.

Пасля тэрарыстычных актаў 11 верасня 2001 года каля трохсот сабак пошукава-выратавальнай службы ЗША ў суправаджэнні ратавальнікаў-кінолагаў прачэсвалі месца трагедыі ў пошуках жывых. Залацісты рэтрывер Брэтань — апошні сабака з тых, якія прымалі ўдзел у гэтых страшных падзеях, памерла ва ўзросце 16 гадоў у чэрвені 2016 года. Яе калегі-ратавальнікі праводзілі Брэтань у апошні шлях з усімі належнымі па яе заслугах ушанаваннямі.

Матэрыялы падрыхтаваў Іван КУПАРВАС. *hvir@zviazda.by*

БелВЭБ

Юридический адрес ОАО «Банк БелВЭБ»:

Республика Беларусь, 220004, г. Минск, просп. Победителей, 29

КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС

на 1 июля 2017 года

Наименование банка ОАО «Банк БелВЭБ»

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	на 01.07.2017	на 01.01.2017
1	2	3	4	5
1	АКТИВЫ			
2	Денежные средства	1101	73 470	72 406
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102	515	550
4	Средства в Национальном банке	1103	122 618	163 995
5	Средства в банках	1104	158 086	230 623
6	Ценные бумаги	1105	805 229	897 594
7	Кредиты клиентам	1106	2 616 229	2 385 463
8	Производные финансовые активы	1107	–	–
9	Инвестиции в зависимые юридические лица		–	1 292
10	Инвестиции в совместно контролируемые юридические лица		–	–
11	Долгосрочные финансовые вложения	1108	523	267
12	Основные средства и нематериальные активы	1109	195 068	207 605
13	Имущество, предназначенное для продажи	1110	708	708
14	Отложенные налоговые активы	1111	5	5
15	Деловая репутация		–	–
16	Прочие активы	1112	26 232	48 695
17	ИТОГО активы	11	3 998 683	4 009 203
18	ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
19	Средства Национального банка	1201	9 117	12 739
20	Средства банков	1202	1 431 562	1 579 650
21	Средства клиентов	1203	2 024 842	1 889 479
22	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204	9 275	3 352
23	Производные финансовые обязательства	1205	–	–
24	Отложенные налоговые обязательства	1206	67	76
25	Прочие обязательства	1207	38 862	47 072
26	ВСЕГО обязательства	120	3 513 725	3 532 368
27	СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
28	Уставный фонд	1211	117 408	117 408
29	Эмиссионный доход	1212	–	–
30	Резервный фонд	1213	53 876	53 876
31	Фонд переоценки статей баланса	1214	80 580	81 879
32	Накопленная прибыль	1215	233 094	219 219
33	Всего собственный капитал, принадлежащий головной организации		484 958	472 382
34	Доля неконтролирующих акционеров		–	4 453
35	ВСЕГО собственный капитал	121	484 958	476 835
34	ИТОГО обязательства и собственный капитал	12	3 998 683	4 009 203

КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ о прибылях и убытках

за 6 месяцев 2017 года

Наименование банка: ОАО «Банк БелВЭБ»

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	За 6 месяцев 2017 года	За 6 месяцев 2016 года
1	2	3	4	5
1	Процентные доходы	2011	178 840	207 062
2	Процентные расходы	2012	91 191	106 588
3	Чистые процентные доходы	201	87 649	100 474
4	Комиссионные доходы	2021	43 239	43 990
5	Комиссионные расходы	2022	13 930	13 342
6	Чистые комиссионные доходы	202	29 309	30 648
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203	53	643
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	778	28
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	8 058	9 856
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	(190)	11
11	Чистые отчисления в резервы	207	25 166	52 173
12	Прочие доходы	208	6 830	9 808
13	Операционные расходы	209	72 055	66 356
14	Прочие расходы	210	4 872	3 061
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211	30 394	29 878
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212	4 880	3 231
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2	25 514	26 647
18	Доля в прибыли (убытке) зависимых юридических лиц		–	–
19	Доля в прибыли (убытке) совместно контролируемых юридических лиц		–	–
20	ИТОГО ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)		25 514	26 647
21	Доля в прибыли (убытке), принадлежащая головной организации		25 514	25 920
22	Доля неконтролирующих акционеров в прибыли (убытке)		–	727
23	Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях			
24	Базовая прибыль на простую акцию	22	–	–
25	Разводненная прибыль на простую акцию	23	–	–

Председатель Правления **Н. В. Лузгин**

Главный бухгалтер **Л. А. Филиппова**

Дата подписания: 3 августа 2017 года

Консолидированная бухгалтерская (финансовая) отчетность размещена на сайте www.belveb.by в разделе «О банке / Финансовые показатели деятельности банка / Квартальная финансовая отчетность / Квартальная финансовая отчетность за 2017 год, составленная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь».

ОАО «Банк БелВЭБ». Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности от 27.12.2013 №6. УНП 100010078

БелВЭБ

Юридический адрес ОАО «Банк БелВЭБ»:

Республика Беларусь, 220004, г. Минск, просп. Победителей, 29

КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ФИНАНСОВОМ ПОЛОЖЕНИИ ОАО «Банк БелВЭБ»

(в тысячах белорусских рублей)

	30.06.2017 (неаудировано)	31.12.2016
Активы		
Денежные средства и их эквиваленты	313 124	437 088
Драгоценные металлы	514	551
Средства в кредитных организациях	51 766	38 592
Кредиты клиентам	2 573 856	2 385 393
Инвестиционные ценные бумаги, имеющиеся в наличии для продажи	733 169	824 439
Инвестиции в ассоциированную компанию	3 914	3 915
Основные средства	148 165	151 197
Активы, построенные для продажи	10 283	13 236
Инвестиционная недвижимость	4 018	5 291
Нематериальные активы	34 201	39 636
Текущий актив по налогу на прибыль	9	762
Отложенные активы по налогу на прибыль	15 912	6 441
Прочие активы	31 679	44 487
Итого активы	**3 920 610**	**3 951 028**
Обязательства		
Средства кредитных организаций	1 207 858	1 358 520
Задолженность перед Национальным банком Республики Беларусь	9 052	12 739
Средства клиентов	2 021 505	1 892 433
Выпущенные долговые ценные бумаги	9 275	3 352
Текущие обязательства по налогу на прибыль	2 687	1 068
Отложенные обязательства по налогу на прибыль	1 104	887
Прочие обязательства	24 294	24 772
Субординированный кредит	198 406	196 607
Итого обязательства	**3 474 181**	**3 490 378**
Капитал		
Уставный капитал	473 057	473 057
Эмиссионный доход	458	458
Дополнительный капитал	5 485	5 485
Фонд переоценки зданий	23 191	23 390
Накопленный дефицит	(64 478)	(51 141)
Итого капитал, приходящийся на акционеров Банка	**437 713**	**451 249**
Неконтрольные доли участия	8 716	9 401
Итого капитал	**446 429**	**460 650**
Итого капитал и обязательства	**3 920 610**	**3 951 028**

КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ ОАО «Банк БелВЭБ»

за период, закончившийся 30 июня 2017 года

(в тысячах белорусских рублей)

	За 6 месяцев, закончившихся 30.06.2017 (неаудировано)	За 6 месяцев, закончившихся 30.06.2016 (неаудировано)
Процентные доходы		
Кредиты клиентам	160 195	189 019
Инвестиционные ценные бумаги	31 838	26 458
Средства в кредитных организациях	1 536	1 728
Финансовая аренда	55	117
	193 624	**217 322**
Процентные расходы		
Средства кредитных организаций	(40 151)	(52 121)
Средства клиентов	(44 054)	(46 181)
Субординированный кредит	(6 811)	(5 144)
Выпущенные долговые ценные бумаги	(322)	(458)
	(91 338)	**(103 904)**
Чистый процентный доход	**102 286**	**113 418**
Резерв под обесценение кредитов	(81 613)	(35 318)
Эффект первоначального признания активов, по которым начисляются проценты	(498)	(450)
Чистый процентный доход после резерва под обесценение кредитов	**20 175**	**77 650**
Чистые комиссионные доходы	**26 780**	**26 640**
Чистые доходы/(расходы) по операциям в иностранной валюте		
- торговые операции	13 738	15 686
- операции с производными финансовыми инструментами	(191)	1
- переоценка валютных статей	(9 641)	(6 587)
Доля в чистом убытке ассоциированной компании	(1)	(147)
Дивиденды	60	41
Прочие доходы	18 972	11 198
Непроцентные доходы	**49 717**	**46 832**
Расходы на персонал	(32 844)	(31 964)
Амортизация	(11 978)	(7 012)
Налоги кроме налога на прибыль	(1 896)	(1 733)
Прочие операционные расходы	(29 543)	(28 609)
Прочие расходы от обесценения и создания резервов	(138)	(10)
Непроцентные расходы	**(76 399)**	**(69 328)**
(Убыток)/прибыль до налога на прибыль	**(6 507)**	**55 154**
Налог на прибыль	3 789	(9 522)
(Убыток)/прибыль за отчетный период	**(2 718)**	**45 632**
Приходящиеся на		
- акционеров Банка	**(3 897)**	**44 998**
- неконтрольные доли участия	1 179	634

Председатель Правления **Н. В. Лузгин**

Главный бухгалтер **Л. А. Филиппова**

Дата подписания: 9 августа 2017 года

Консолидированная бухгалтерская (финансовая) отчетность, составленная в соответствии с требованиями МСФО, размещена на сайте www.belveb.by в разделе «О банке / Финансовые показатели деятельности банка / Квартальная финансовая отчетность / Квартальная финансовая отчетность по МСФО за 2017 год».

ОАО «Банк БелВЭБ». Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности от 27.12.2013 №6. УНП 100010078

Остров чистоты

РЕЗУЛЬТАТЫ РОЗЫГРЫША ЦЕННЫХ ПРИЗОВ СРЕДИ УЧАСТНИКОВ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «ЛЕТНЯЯ УДАЧА ВМЕСТЕ С НЭФИС!»

Организатор РИ: Частное торговое унитарное предприятие «ЗападХимТорг» УНП 590828925, зарегистрировано Приказом начальника главного управления юстиции Гродненского областного исполнительного комитета от 16.01.2008 №2-р

Местонахождение организатора РИ: ул. Комсомольская, д. 42А, к. 1, 231335, Гродненская область, Ивьевский район, д. Липнишки, Республика Беларусь.

Почтовый адрес: 220068, ул. Каховская, д. 70а, пом. 8

Место и дата проведения розыгрыша: 29 июня 2017 года, г. Минск, ул. Сторожовская, д. 15, комната переговоров.

Наименование рекламной игры: рекламная игра называется «ЛЕТНЯЯ УДАЧА ВМЕСТЕ С НЭФИС!», проводилась в соответствии с условиями Правил, с соблюдением требований законодательства Республики Беларусь без взимания с участников игры платы.

Срок начала и окончания рекламной игры: 15.06.2017 – 31.08.2017 (включая период розыгрыша и вручения призов).

Государственная регистрация РИ: Свидетельство № 3021 от 29.05.2017 МАРиТ РБ.

Количество участников РИ: В розыгрыше участвовало 5328 участников игры. По итогам игры «ЛЕТНЯЯ УДАЧА ВМЕСТЕ С НЭФИС» разыгрывается призовой фонд, сформированный за счет денежных средств и имущества Организатора игры. За время проведения рекламной игры призовой фонд был разыгран полностью.

Порядок проведения розыгрыша: Определение выигрышных номеров получателей призов происходит путем случайного вытаскивания анкет из лототрона.

Призы, участвующие в розыгрыше:

№ п/п	Наименование	Кол-во, шт.	Цена за ед., бел. руб. с НДС	Всего, бел. руб. с НДС
1	Интернет-планшет I-Pad Apple mini 4 Wi-Fi +Cellular 32GB Space Model A1550	5	1086,00	5430,00
	и денежное вознаграждение	5	145,69	728,45
2	Мультиварка Redmond RMC-M4510 черный	20	159,50	3190,08
	и денежное вознаграждение	20	7,25	145,00
3	Холодильник-морозильник Bosch KGN 39VP15R, апробационный тип KRKKGN39A	10	1210	12099,96
	и денежное вознаграждение	10	164,22	1642,20
4	Кофемашина автоматическая Philips Series 2000 Vapore CMF bk 8649/01	10	788,00	7880,04
	и денежное вознаграждение	10	101,16	1011,60

В ходе розыгрыша определены следующие анкеты получателей призов:

Результаты розыгрыша:

Интернет-планшет I-Pad Apple mini 4 Wi-Fi +Cellular 32GB Space Model A1550, стоимостью 1086,00 рубля и денежное вознаграждение в размере 145,69 рубля.

№ п/п	№ кассового чека	Фамилия Имя Отчество
1	00013552	Севрук Вероника Александровна
2	02620178я	Козлов Геннадий Иванович
3	03610209	Гейлаш Анна Бернардовна
4	03520030	Соболевская Августа Ивановна
5	0245	Линник Леонид Анатольевич

Мультиварка Redmond RMC-M4510 черный, стоимостью159,50 и денежное вознаграждение в размере 7,25 рубля.

№ п/п	№ кассового чека	Фамилия Имя Отчество
1	0026	Конопелько Наталья Мечиславовна
2	0215	Скиндер Мирослава Александровна
3	03690170	Пацикалик Ольга Николаевна
4	03340285	Хоховская Мария Григорьевна
5	03710244	Медведев Александр Николаевич
6	0125	Ногина Светлана Антоновна
7	03170161	Гладкий Александр Александрович
8	00000933	Петрошенко Вера Васильевна
9	004700129	Ромась Ирина Николаевна
10	0059	Сороко Елена Валентиновна
11	03360074	Самборский Александр Юрьевич
12	02620277	Кондратеня Алишер Викторович
13	0044	Кишея Наталья Николаевна
14	02480013	Пищенко Эдита Станиславовна
15	0187	Харкова Татьяна Васильевна
16	0045	Рупакова Наталья Васильевна
17	01220225	Самусенко Татьяна Алексеевна
18	0309	Гречаник Елена Михайловна
19	0191	Петровец Дмитрий Николаевич
20	0055	Кожемякина Елена Николаевна

Холодильник-морозильник Bosch KGN 39VP15R, апробационный тип KRKKGN39A, стоимостью 1210 рублей и денежное вознаграждение в размере 164,22 рубля.

№ п/п	№ кассового чека	Фамилия Имя Отчество
1	00031502	Кухаренко Любовь Николаевна
2	0356009	Парналова Елена Станиславовна
3	03820073	Свитенкова Юлия Александровна
4	03610042	Ловцова Анастасия Анатольевна
5	01470035	Тищеконина Валентина Ивановна
6	03830154	Фомкина Людмила Леонидовна
7	03740020	Вакульчик Светлана Николаевна
8	00006624	Машкевская Татьяна Ивановна
9	02660045	Гайшун Анастасия Михайловна
10	03770053	Кучерявый Александр Николаевич

Кофемашина автоматическая Philips Series 2000 Vapore CMF bk 8649/01, стоимостью 788,00 рубля и денежное вознаграждение в размере 101,16 рубля.

№ п/п	№ кассового чека	Фамилия Имя Отчество
1	0054	Журавель Нина Дмитриевна
2	03140041	Костюк Александра Анатольевна
3	00028633	Шуляковская Ирина Анатольевна
4	0048	Селемина Алла Григорьевна
5	03040116	Кирпа Елена Петровна
6	02240204	Ефремов Артур Викторович
7	02650235	Ясинская Диана Зигмундовна
8	002200237	Козлова Анастасия Владимировна
9	01370121	Алейник Лидия Ивановна
10	03810281	Усик Александр Николаевич

Члены комиссии с Протоколом розыгрыша ценных призов среди участников РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «ЛЕТНЯЯ УДАЧА ВМЕСТЕ С НЭФИС!» ознакомлены и свидетельствуют, что нарушений порядка проведения розыгрыша отмечено не было.

Телефоны для справок: Velkom +375 (29) 354 49 91, городской телефон 8 (017) 335 07 06 с 10.00 до 17.00 в рабочие дни.

Полные правила рекламной игры «ЛЕТНЯЯ УДАЧА ВМЕСТЕ С НЭФИС!» были опубликованы в газете «Звязда» от 6 июня 2017 г. и на сайте www.ostrov-chistoty.by

«Нельга, каб жанчыну "напаўнялі" розныя мужчыны»

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

КАЛІ я спытала дырэктара медцэнтра «Гармонія» Алену ГЕРАСІМОВІЧ, з чым яна сябе асацыюе, пачула тры словы «Жанчыны. Дзіця. Абраз». Рэч у тым, што мая суразмоўніца — урач-акушэр-гінеколаг, кандыдат медыцынскіх навук — вось ужо 22 гады, як сама кажа, служыць людзям. Спачатку выратоўвала жыцці, а цяпер дапамагае з'яўляцца на свет новым.

Пра безнадзейнасць, Космас ды «вузел», які развязаўся

Да мяне вельмі часта прыходзяць пары, якія мараць стаць бацькамі, але па розных прычынах не могуць ажыццявіць сваю мару. Адразу кажу, што я не чараўніца, але зраблю ўсё, што ў маіх сілах. І дадаю, што на ўсё воля Божая. Часам бываюць такія сітуацыі, што я зрабіла нават немагчымае, але нічога не атрымліваецца. І тут з'яўляецца нейкая звышсіла — Космас, Бог, называйце гэта, як хочаце, якая дапамагае гэтай пары.

Чамусьці мне ўспомнілася мая першая пацыентка Ірына з пазаматачнай цяжарнасцю. Падчас аперацыі давялося выдаліць гэтай маладой жанчыне матачную трубу. Калі я падчышчала другую трубу, старалася ўсё зрабіць надзвычай добра. А ўнутры, па шчырасці, было моцнае адчуванне безнадзейнасці. Маўляў, я пакіну гэтую трубу, але малаімаверна, што жанчына зможа ўжо мець натуральныя роды. І якое было маё здзіўленне і радасць, калі Ірына праз паўгода паступіла да мяне з цяжарнасцю.

У Алесі і Дзмітрыя таксама доўга не было дзетак. Яны былі катэгарычна супраць ЭКА. Тады я параіла ім усынавіць дзіця. Пара прыняла такое свядомае рашэнне. І «вузел» развязаўся. Неўзабаве пасля гэтага ў Алесі і Дзімы з'явілася двое ўласных дзяцей. Хіба гэта не цуд?

У кожнай жанчыны павінен быць асабісты гінеколаг. Але я яшчэ і за культуру «другога меркавання ўрача». Калі ў цябе ёсць нейкая праблема і яна не вырашаецца з адным доктарам, то трэба пачуць меркаванне іншага спецыяліста. Добры гінеколаг той, які лечыць бясплоднасць на працягу года. Калі за гэты час не дапамог, то трэба ці іншы погляд, ці іншая тэхналогія. Я — за сямейную медыцыну. У мяне ёсць некалькі сем'яў, дзе да мяне ходзяць мама, дочкі, нявесткі. Мне прыемна, што яны выбралі мяне сваім гінеколагам. Але я не пакрыўдзілася б, калі б пры нейкай сітуацыі яны захацелі пачуць альтэрнатыўнае меркаванне.

Пра роды дома, хрэсніцу Машу ды камячок шчасця

Калі б да мяне прыйшла жанчына з просьбай зрабіць аборт, я адмовіліся б. Паглядзіце, побач з нашым цэнтрам — касцёл, царква. Як можна грашыць у такім месцы? У «Гармоніі» не робяць аборты. Гэта мой свядомы выбар і прынцыповая пазіцыя. Для мяне гэта як псаваць карму. На жаль, калі я пачынала свой шлях у гінекалогіі, мне даводзілася рабіць аборты. Гэта было абавязковым. І мне было балюча ад гэтага *(плача)*. Я не маю права асуджаць жанчын, бываюць розныя абставіны. Але ў мяне цвёрдае перакананне, што калі Бог даў дзіця, то дасць і сілы, каб яго выгадаваць.

Маёй хрэсніцы Машы 18 гадоў. Яе маці пастаянна мне дзякуе. Кажа: калі б не было цябе, магло не быць і Машы. У свой час Машына мама была маёй пацыенткай. Так складваліся жыццёвыя абставіны, што нарадзіць ёй было цяжка. Але мне ўдалося знайсці словы, якія пераканалі жанчыну ў тым, што дзіця ёй патрэбнае. Сёння яна шчаслівая, што ў яе ёсць Маша — надзея і апора.

Я — трэцяе дзіця ў сям'і. Тады былі вельмі цяжкія часы ў матэрыяльным плане. І я вельмі ўдзячная сваёй маці, што яна знайшла сілы мяне выгадаваць.

Зачацце — гэта задавальненне, цяжарнасць — гэта цярпенне, роды — гэта праца. А мацярынства і бацькоўства — гэта і задавальненне, і цярпенне, і праца.

Я дрэнна стаўлюся да родаў дома. Бо, акрамя хатняй утульнасці і камфорту, яны нічога не даюць. Побач павінен быць спецыяліст. У Германіі роды дома прымае сертыфікаваная акушэрка, якая прайшла шэраг навучальных праграм, трэнінгаў. У яе заўсёды ёсць аўтамабіль і дамоўленасць з медустановай: у выпадку чаго — мы тут. У нас жа пакуль што няма такіх акушэрак і дактароў, якія могуць аказваць спецыялізаваную дапамогу ў хатніх умовах. У выніку можа здарыцца жудасная сітуацыя, калі пад пагрозай будуць два жыцці — і жанчыны, і дзіцяці. Роды дома — гэта каласальная адказнасць і непрадказальнасць. Можа быць абвіццё пупавіны вакол шыі, крывацёк. Такая сітуацыя, дзе трэба імгненна прыняць рашэнне. Таму я за нараджэнне дзяцей у сценах медустановы.

І за тое, каб больш пар нараджалі разам. Я — за ўсвядомленыя партнёрскія роды. На пэўным этапе трэба спіну памасіраваць жанчыне, падзьмуць, каб выклікаць правільную схватку. Праводзілася даследаванне, што такія шлюбы больш моцныя.

Я сваю дачку нараджала 22 гады таму. У мяне былі партнёрскія роды. Я не хацела трывожыць раней за час калег, таму не спяшалася ехаць у раддом. Сама сябе абязбольвала. Паколькі я сама акушэр-гінеколаг, то разумела, што са мной адбываецца. Нават вылічыла, што дачка павінна нарадзіцца 29 красавіка. І вось 10 гадзін вечара. Адчуваю, што схватак няма. Кажу мужу: «Нешта не так». Віталь бярэ кніжку пра пераношаную цяжарнасць. Ляжым, чытаем. Праз 10 хвілін у мяне пачаліся схваткі. Мы паехалі ў раддом, і праз гадзіну я нарадзіла. Ніколі не была такой шчаслівай, як у момант нараджэння дачкі. Гэта так кранальна! Ніколі не забуду слёзы радасці на вачах у майго сур'ёзнага мужа, які трымаў на руках гэты камячок шчасця.

Мая дачка вучыцца ўжо на пятым курсе медуніверсітэта. Хадзіла ў гінекалагічны гурток, летась заняла першае месца ў студэнцкай алімпіядзе па гінекалогіі. Яна пакуль яшчэ не выбірала спецыялізацыю, але, відаць, усё ж такі ў мяне будзе змена. Я рада, бо магу падзяліцца з ёй сваім досведам. Ведаю, што гэта складаны шлях. Але быць доктарам — гэта цудоўна.

Пра крылы, багацце ды праўду, якой бы яна ні была

У ардынатуры мне давялося працаваць у НДІ анкалогіі. Гэта было вельмі цяжкое аддзяленне ў псіхалагічным плане. Я вельмі суперажывала сваім пацыентам. Даводзілася аперыраваць маладых жанчын. Памятаю, як адна з пацыентак, педагог, трымала мяне за руку пасля аперацыі і пыталася: «Леначка Міхайлаўна, у мяне ж не рак, праўда?»

Я вучылася, як правільна гаварыць пацыенту пра рак, у амерыканскага прафесара псіхатэрапеўта і анколага. Калі раней думала, што на апошняй стадыі можна пашкадаваць чалавека, то цяпер перакананна, што, як бы ні было цяжка, трэба гаварыць праўду. Гэта шанц для пацыента штосьці зразумець, усвядоміць і нават перамагчы хваробу. Цуды ж ніхто не адмяняў. Ды і медыцына не стаіць на месцы. Людзі, якім выдалілі на ранняй стадыі ракавую пухліну, жывуць яшчэ шмат гадоў. Проста трэба ўмець размаўляць з пацыентам, тлумачыць кожны этап. Сказаць, што ёсць ты, ёсць я і ёсць хвароба — нас жа двое, і ўдваіх мы пераможам яе.

Людзі, на жаль, мала клапоцяцца пра сваё здароўе. І толькі калі «накіпела», ідуць да ўрача. Я за здаровы лад жыцця і прафілактычную медыцыну. Калі хоць бы адзін раз на год наведваць доктара, то ты не дасі шанц развіцца хваробе. Я таксама за тое, каб не было бязладнага палавога жыцця. Нельга, каб жанчыну «напаўнялі» розныя мужчыны, і наадварот. Гэта дакладна не шлях да гармоніі. Больш за тое, любое запаленне можа ініцыяваць рак.

Мне шанцуе па жыцці на людзей. Працавала з Кацярынай Яфімаўнай Вішнеўскай — гэта эталон у беларускай анкалогіі. Яна рабіла самыя складаныя аперацыі. А я трымала ёй кручкі, была трэцім асістэнтам. Маімі настаўніцамі таксама былі Ірына Аляксандраўна Касенка і Вольга Анатолеўна Перасада. Гэта вялікае шчасце і гонар вучыцца ў такіх прафесіяналаў.

Шчаслівыя мамы дораць на памяць Алене ГЕРАСІМОВІЧ фотаздымкі сваіх дзетак.

У любой спецыяльнасці, асабліва ў акушэрстве і гінекалогіі, трэба ўдасканальвацца. Рэгулярна ўдзельнічаю ў медыцынскіх форумах, канферэнцыях, сімпозіумах, бо адукацыя — гэта інвестыцыі ў сябе і сваіх пацыентаў. З'яўляюся членам Сусветнай арганізацыі рэпрадукцыі чалавека, у кастрычніку будзе кангрэс у Санкт-Пецярбургу, таксама туды паеду, бо там будуць навінкі. У верасні планую вучыцца ў Акадэміі паслядыпломнай медыцынскай адукацыі, нягледзячы на тое, што ў мяне за плячыма ўжо ёсць 500 гадзін у клінічнай ардынатуры.

Люблю вучыцца. Але не назапашваю гэтыя веды ў сабе. Мне падабаецца дзяліцца. Не так даўно Ігар Ман, аўтар кніг па маркетынгу і рабоце з кліентамі, прыязджаў у Мінск. Я была на яго выступленні і купіла некалькі кніг, якія ён рэкамендаваў. Адну з іх вы бачылі на маім працоўным стале — «Кліенты на ўсё жыццё» Карла Сьюэла і Пола Браўна. Я купляю шмат кніг, спачатку чытаю сама, а пасля іх чытаюць мае супрацоўнікі. Каб лепш разумець сваіх пацыентаў.

Вельмі важна, каб паміж мамай і дачкой былі даверлівыя адносіны. І не варта саромецца абмяркоўваць фізіялагічныя пытанні. Пра менструацыю дзяўчынка павінна даведацца не ад сяброўкі, а ад мамы. Тое ж самае датычыцца і адносінаў з хлопцамі. Мама павінна расказаць, што ўступаць у інтымныя адносіны трэба абавязкова па каханні, і распавесці пра метады кантрацэпцыі. Размаўляць на інтымныя тэмы з сынам — прывілегія таты. Хлопчыка трэба выхоўваць самастойным, каб ён быў апорай у сям'і, каб мог узяць адказнасць за ўчынкі, за сяброў, за жонку. Мне б хацелася, каб побач з маёй дачкой быў чалавек, падобны на майго мужа.

13 гадоў таму я праходзіла стажыроўку ў адной з вядучых клінік Германіі. За тры месяцы мне пашчасціла асісціраваць у замежных лекараў падчас 46 аперацый. Калі вярнулася ў Беларусь, у мяне як быццам выраслі крылы. Захацелася перанесці сюды ўбачанае за мяжой, каб людзі атрымлівалі і сэрвіс, і клопат, і прафесійныя веды. Я агучыла ідэю стварыць уласны медцэнтр, а муж яе падтрымаў. Без яго падтрымкі і аналітычнага розуму наўрад ці адважылася б на адкрыццё сваёй справы.

Я мару, каб у мяне было шмат унукаў. Хацела б, каб у маёй дачкі была вялікая дружная сям'я, каб яна ў першую чаргу рэалізавалася як мама. Так здарылася, што Бог падарыў нам з мужам толькі адно дзіця. Але я ад душы радуюся за людзей, багатых сям'ёй. Днямі ў мяне на прыёме была жанчына з Вялікабрытаніі. Яна прыйшла на УГД разам з мужам і чатырма малымі. Яна аказалася цяжарнай пятым дзіцем. Якія яны шчаслівыя!

Многія жанчыны звяртаюцца да дактароў з праблемамі бясплоднасці. Я хачу, каб яны мелі шчасце выканаць сваю мацярынскую функцыю. Калісьці адна з маіх пацыентак напісала ў кнізе водгукаў: «Дзякуй за шчасце быць Мамай». Мару, каб такіх шчаслівых жанчын было як мага больш.

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.
nadzieja@zviazda.by

Мінск — Жодзіна.

Бліц-апытанне

— Алена, як вы аднаўляеце энергію?

— Рэгулярна хаджу ў басейн. Люблю ваду, яна ачышчае. Непадалёк ад нашага дома ёсць веласіпедная сцежка, дзе мы катаемся з мужам на веласіпедзе. Не так даўно нам падарылі палкі для скандынаўскай хады. Таму цяпер у нас новае захапленне.

— Ці ёсць у вас «месца сілы»?

— Бацькоўскі дом.

— На якую тэму вы пісалі дысертацыю?

— Я даследавала паталагічны клімакс. У нашай рэспубліцы толькі дзве дысертацыі на гэтую тэму. У калегі — па астэапарозе, зменах у касцях падчас клімаксу. А ў мяне — звязаная з псіхаэмацыйнымі метабалічнымі парушэннямі. Клімаксу не варта баяцца. Калі раней мамы цярпелі прылівы і змены настрою, павышэнне ціску, то цяпер трэба проста выбраць спецыяліста і параіцца з ім. Усе жанчыны розныя: адной трэба зёлкі, другой — гамеапатыя, трэцяй — гарманальная тэрапія.

— Цікава, якія кнігі вы чытаеце?

— Мой любімы аўтар — амерыканскі псіхатэрапеўт Ірвін Ялом. Ва ўсіх яго кнігах («Углядаючыся ў сонца», «Калі Ніцшэ плакаў», «Хроніка вылячэння» і інш.) медыцына пераплятаецца з псіхатэрапіяй і псіхалогіяй. Акрамя таго, мяне цікавіць бізнес-літаратура. Цяпер, у прыватнасці, чытаю Іцхака Адызеса «Кіраванне жыццёвым цыклам карпарацыі». Гэта тоўстая кніга. Хачу яе адужаць за лета.

— А ёсць настольная кніга, якую вы перачытваеце пастаянна?

— Гэта зборнік вершаў Ганны Ахматавай.

— Што б вы параілі жанчыне? А дзяўчыне? А дзяўчынцы (гэтае пытанне калісьці задалі актрысе Эдзіт Піяф)?

— Любіць і берагчы сябе з маладосці.

РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 28 августа 2017 г. в 10.00 повторного открытого аукциона со снижением начальной цены на 40% после очередных несостоявшихся торгов по продаже объектов недвижимости и иного имущества (лот №1), расположенных по адресу: Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, ул. Молодежная, 3А, принадлежащих Совместному открытому акционерному обществу «Речицапиво» на праве собственности

Состав лота:

Здание главного производственного корпуса с силосными корпусами, инв. №340/С-300667. Общая площадь 21754,0 кв. м. *Составные части и принадлежности: две пятиэтажные пристройки, пристройка, подвал под основным зданием, сусловое отделение, солодовенное отделение, два крыльца, подсилосное отделение, подработочное отделение, силосные корпуса, здание весов, навес.* **Часть здания – 2 359,4 кв. м – сдана в аренду сроком до 31.12.2017 г.**

Здание подсобного корпуса, инв. №340/С-300672. Общая площадь 2452,3 кв. м. **Часть здания – 1 662,5 кв. м – сдана в аренду сроком до 31.12.2017 г.**

Здание пункта санобработки и заправки пивцистерн, инв. №340/С-300660. Общая площадь 158,0 кв. м. **Здание сдано в аренду сроком до 31.12.2017 г.**

